МРТ ЦІ КТ — ЯК ВЫБРАЦЬ МЕТАД ДЫЯГНОСТЫКІ? 5

ХІМІЯ ТВОРЧАСЦІ ЯНУША ВІШНЕЎСКАГА 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

6 ЛІПЕНЯ 2019 г. СУБОТА

№ 125 (28992)

ЗВЯЗДА

НАШЧАДКІ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Трэцяга ліпеня ў краіне нарадзіліся 189 беларусаў — з іх двое двайнят

За апошнія пяць гадоў у Беларусі колькасць шматдзетных сям'яў павялічылася з 78 тысяч да 110 тысяч з лішкам, паведаміў міністр аховы здароўя Уладзімір КАРАНІК падчас акцыі «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей».

«Гэта тэндэнцыя сапраўды вельмі радуе, таму што чым часцей у грамадстве чуваць дзіцячы смех, тым святлейшая будучыня гэтага грамадства», — выказаў упэўненасць міністр. Маладым мамам ён пажадаў, каб усе сустрэчы з медыцынскімі работнікамі былі толькі плановыя. І запрасіў яшчэ не раз наведаць РНПЦ «Маці і дзіця» з добрай нагоды — тым больш, што цэнтр чакаюць перамены.

Па словах Уладзіміра Караніка, у цэнтры плануецца ўмацаваць матэрыяльна-тэхнічную базу. Частка абсталявання будзе закупленая ўжо сёлета, на гэты і наступны гады намечаны распрацоўка праекта і пачатак рэканструкцыі рэанімацыйнага аддзялення, сёмага і восьмага карпусоў цэнтральнага стэрылізацыйнага аддзялення.

Фота БелТА.

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА адзначыла, што цудоўна сустрэцца з маладымі мамамі, у якіх у жыцці адбылася сапраўды радасная падзея, з пажаданнямі ўсяго самага добрага ім і дзеткам, каб раслі здаровыя, моцныя, былі сапраўднымі беларусамі. «Гэта свята не толькі для жанчын, якія нарадзілі для сябе такое шчасце, але і для ўсіх нас, бо хочацца, каб нас, беларусаў, было як мага больш. Дзяржава робіць усё, каб падтрымаць сям'ю», — звярнулася да жанчын Наталля Качанава.

У РНПЦ «Маці і дзіця» таксама завіталі павіншаваць мам заслужаная артыстка Беларусі Ірына ДАРАФЕЕВА і старшыня РГА «Белая Русь», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Генадзь ДАВЫДЗЬКА.

Акцыя «Белая Русь» — з любоўю да дзяцей» праводзіцца з 2009 года. Ужо больш за тры тысячы мам па ўсёй краіне атрымалі падарункі ў гонар Дня Незалежнасці. Сёлета маладых матуль і нованароджаных па ўсёй краіне віншавалі члены ўрада, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, кіраўнікі адміністрацый раёнаў, лідары арганізацыйных структур «Белай Русі».

У «Маці і дзіцяці» парадзіхі асабліва падзякавалі прадстаўнікам улады за праграму «Сямейны капітал» і папрасілі, каб яе прадоўжылі. Наталля Качанава нагадала, што Прэзідэнт працягнуў праграму на пяць гадоў, ёсць прапановы па карыстанні сродкамі.

«Таму ўсё будзе добра», — запэўніла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

«Абавязваемся выхаваць годных грамадзян Рэспублікі Беларусь», — заўсміхаліся маладыя мамы.

Варвара МАРОЗАВА.

Фінансы

Рэзервы ўжо больш за восем мільярдаў долараў

За чэрвень золатавалютныя рэзервы нашай краіны выраслі на 200,7 мільёна долараў (на 2,5 %) пасля росту ў маі на 521,6 мільёна долараў (на 6,9 %), паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Нацыянальнага банка краіны.

Памер міжнародных рэзервовых актываў Беларусі на 1 ліпеня 2019 года, па папярэдніх звестках, склаў 8 290,7 мільёна долараў ЗША ў эквіваленце. Як удакладнілі ў рэгулятары, у чэрвені ўрад і Нацбанк выканалі знешнія і ўнутраныя абавязацельствы ў замежнай валюце на суму каля 250 мільёнаў долараў.

«Асноўным фактарам росту ўзроўню золатавалютных рэзерваў у чэрвені стала павышэнне цаны золата на міжнародным рынку. Таксама павелічэнню рэзерваў спрыялі купля замежнай валюты Нацыянальным банкам на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа», паступленне замежнай валюты ў бюджэт, у тым ліку ад збірання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты, і паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце», — растлумачылі ў Нацбанку.

Сяргей КУРКАЧ.

Вытокі малой радзімы

КАРА́ЛІ НАД ЯЗУСАМ

МАЙСТРЫХА па народнай вышыўцы Аксана КАРАБЛІНА і майстар па ткацтве Раіса АГЕЛЬ жывуць у Чашніцкім раёне, больш за дзесяць гадоў працуюць у мясцовым Доме рамёстваў — захоўваюць і адраджаюць рэгіянальнае побытавае майстэрства, папаўняюць каштоўную скарбонку ўнікальнымі ручнікамі, сяткамі і вышытымі ўручную. Дзякуючы руплівым рукадзельніцам, чашніцкі Дом рамёстваў правёў грунтоўную навукова-даследчую работу і рэканструяваў жаночы строй. Такія строі (у іх Аксана і Раіса пазіруюць для фота) насілі мясцовыя прыгажуні-модніцы яшчэ ў канцы XIX — пачатку XX стагоддзя. Цяпер на кожным гарадскім і раённым свяце, на прастольных абласных і рэспубліканскіх фестывалях майстрыхі красуюцца ў сваіх вытачаных, расквечаных арнаментамі і кветкамі сарочках і фартухах, абвітых стракатымі паясочкамі і чырвонымі каралямі.

— Мы імкнёмся паказаць самабытнасць свайго Пазвярскага краю, вярнуць памяць да сваіх каранёў, паказваць, як чашніцкі строй гарманічна пасуе ў любым асяроддзі — і на сцэне, і сярод людзей, і, асабліва, на ўлонні прыроды, — зазначаюць рукадзельніцы.

Для гэтага фотасадымка мы выбралі самую вядомую ў акрузе крыніцу пад назвай Еэус. Мясцовыя людзі называлі крыніцу на свой лад — «Язус», націскаючы на другі склад. А знаходзіцца выток у лесе за вёскай Вішкавічы. Здаўна крынічная вада пілася гаючай, бо дапамагала ад хваробаў вачэй, доўга захоўвалася, у яе спецыфічны пах. Цяпер крыніца ахоўваецца дзяржавай, ёй нададзены статус помніка. Недалёка ад Еэуса знаходзіцца і гарадзішча, і возера — Святое.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

ЦЫТАТА ДНЯ

Дзмітрый КАРЗЮК, начальнік УДАІ МУС:

«ДАІ прапануе ўвесці падзел ступеняў ап'янення кіроўцаў і прызначаць у сувязі з гэтым розныя пакаранні. Трэба ўвесці градацыю ступеняў ап'янення — з 0,3 праміле алкаголю ў крыві караць штрафам у 100 базавых велічынь і пазбаўленнем правоў на тры гады. Наступная градацыя алкагольнага ап'янення — 0,8 праміле. Пасля 0,8 мы прапануем адказнасць 200 базавых і пазбаўленне права кіравання тэрмінам на 5 гадоў. Мы ўзгаднілі гэтыя папраўкі з усімі зацікаўленымі, нас падтрымалі па ўзмацненні жорсткасці. Думаю, што пры перапрацоўцы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях гэтая норма будзе ўнесена».

Класныя навіны

Заробкі педагогам будуць налічваць па-новаму

Сістэма аплаты працы работнікаў сферы адукацыі зменіцца з 1 студзеня 2020 года

Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства адукацыі ад 3 чэрвеня 2019 г. № 71 «Аб некаторых пытаннях аплаты працы работнікаў у сферы адукацыі».

Дакументам, у прыватнасці, устанаўліваюцца тарыфныя разрады паводле пасад педагагічных работнікаў бюджэтных арганізацый, пералік стымулюючых і кампенсавальных выплат педагагічным работнікам і служачым, занятым у адукацыі, пералік стымулюючых і кампенсавальных выплат работнікам бюджэтных арганізацый, падпарадкаваных Міністэрству адукацыі, і ўстаноў адукацыі, падпарадкаваных мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, якія адносяцца да сферы дзейнасці Міністэрства адукацыі. Зацверджаны таксама інструкцыі аб памерах і парадку ажыццяўлення стымулюючых і кампенсавальных выплат.

Уязджэнне новай сістэмы аплаты працы ажыццяўляецца ў межах бюджэтных сродкаў, прадугледжаных на аплату працы, і пазабюджэтных сродкаў.

Як патлумачылі ў Міністэрстве адукацыі, прынятыя пастановы дазволяць прывесці ўмовы аплаты працы педагагічных работнікаў у адпаведнасць з нормамі прэзідэнцкага ўказа. Значна скароціцца колькасць нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць гэтыя пытанні. Таксама пашырыцца самастойнасць кіраўнікоў арганізацый пры вызначэнні памераў аплаты працы асобных катэгорый работнікаў і выплат стымулюючага характару, якія дазваляюць дыферэнцыяваць заробак у залежнасці ад вынікаў працы.

Пры ўвядзенні новай сістэмы аплаты працы знізнене памераў заработнай платы работнікаў (без прэміравання) не дапускаецца.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Устойлівае развіццё

МІЛЬЁН НА ПРАЦЯГ І ПАЧАТАК

Мёрскі райвыканкам атрымае ад ЕС 975 888 еўра

Агульны кошт праекта — больш за мільён еўра, доля Еўрапейскага саюза складае амаль 90 працэнтаў. Назва праекта досыць мудрагелістая: «Разам для грамады і прыроды: узмацненне працэсу развіцця ў Мёрскім раёне праз супрацоўніцтва мясцовай улады і грамадзянскай супольнасці». Тым не менш у складанай фармулёўцы змяшчаюцца ўсе асноўныя прыкметы таго, што ў выніку павінна атрымацца, — у раёне, на тэрыторыі якога знаходзіцца запаведная тэрыторыя міжнароднага значэння (верхавое балота Ельня), падтрымку атрымліваюць і экалагічная, і сацыяльная, і эканамічная сферы. А працаваць над асваеннем выдатканых донарамі грошай мясцовыя ўлады будуць разам з жыхарамі. Пры гэтым звышмэта — з заканчэннем праекта распачатыя справы павінны набрацъ такую хуткасць і моц, каб паспяховa працягвацца далей, выкарыстоўваючы новыя крыніцы рэсурсаў і ўласны патэнцыял...

СТАР. 2

Фота Вольгі МІЦКЕВІЧ.

Тэрмін асваення грошай — тры гады, стартаваў праект 1 мая гэтага года. Ажыццяўляецца ў партнёрстве з грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (г. Мінск) і Латвійскім сельскім форумам (г. Рыга, Латвія). «Ахове птушак Бацькаўшчыны» належыць прапанова па рэалізацыі праекта. Мясцовыя ўлады з задавальненнем падтрымалі ініцыятыву. Латвійскі сельскі форум гатовы дзяліцца досведам у справе развіцця мясцовых тэрыторый.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Наймацнейшая за 180 гадоў паводка ў Іркуцкай вобласці забрала жыцці 22 чалавек

З 25 чэрвеня ў шасці раёнах Іркуцкай вобласці Расіі адбылося падтапленне ў 103 населеных пунктах, уведзены рэжым НС. Па апошніх звестках, ахвярамі паводкі сталі 22 чалавекі, у тым ліку дзіця, паведамляе ТАСС. Зніклымі без вестак у выніку стыхіі лічацца 15 чалавек. На стане на 4 ліпеня ў Іркуцкай вобласці ў 16 населеных пунктах заставалися падтопленыя 2,7 тысячы жылых дамоў, у якіх пражываюць 6,4 тысячы чалавек. Шкода ад паводкі сельскай гаспадаркі рэгіёна ацэньваецца ў 300 мільёнаў расійскіх рублёў, дарогам — 800 мільёнаў расійскіх рублёў. Па даных Іркуцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, гэта паводка стала найманейшай у рэгіёне за апошнія 180 гадоў.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну і сем'ям загінулых у выніку паводкі.

Ваенны савет Судана і апазіцыя дасягнулі пагаднення аб падзеле ўлады

Ваенны савет Судана і апазіцыя, якія вялі перагаворы ў Хартуме з 3 ліпеня, дамовіліся стварыць Суверэнны савет, які будзе дзейнічаць тры гады. У яго ўвойдуць па пяць прадстаўнікоў ад кожнага з бакоў, а адзінаццатым яго ўдзельнікам стане нейкая грамадзянская асоба ваеннага паходжання. У абавязкі савета будзе ўваходзіць фарміраванне новага ўрада, а таксама прыцягненне да адказнасці вінаватых у гібелі людзей на пратэстных акцыях. У ходзе перагавораў у Хартуме бакі таксама адклалі стварэнне парламента, аб якім дамовіліся ў маі.

У снежні 2018 года павышэнне цэн на хлеб, які з'яўляецца найважнейшым складальнікам рацыёну харчавання суданцаў, прывяло да вулічных пратэстаў. Яны доўжыліся некалькі месяцаў. 11 красавіка армія ўзяла дзяржаўнае кіраванне ў свае рукі пасля адхілення ад улады прэзідэнта Амара аль-Башыра. Пры гэтым быў створаны пераходны Ваенны савет, распушчаны парламент і прыпынена дзеянне канстытуцыі. Апазіцыя абвінавачвала ваенных ва ўзурпацыі ўлады і патрабавала перадачы ўлады грамадзянскім органам кіравання. З пачатку красавіка ў штаб-кватэры арміі праводзілася сядзячая забастоўка, удзельнікі якой дамагаліся перадачы ўлады грамадзянскім сілам. 3 чэрвеня суданскія сілы бяспекі напалі на лагер дэманстрантаў: падчас разгону загінула больш за 30 чалавек, яшчэ 160 пацярпелі.

Мужчына «ажыў» падчас уласнага пахавання

У індыйскім горадзе Лакхнау мужчыну ледзь не пахавалі жывцом. Жыхар Індыі трапіў у ДТЗ. Сваякі плацілі за яго лячэнне, але лекары, як толькі ў сям'і скончыліся фінансавыя сродкі, заявілі пра смерць хворага. Выдалі заключэнне пра смерць і перадалі цела блізкім. Падчас жалобнай цырымоніі аказалася, што рукі мужчыны рухаюцца. Родныя запрасілі лекараў. Тыя канстатавалі, што мужчына жывы, у яго былі пульс і ціск. Мужчыну змясцілі на лячэнне ў іншую клініку. Паліцыя праводзіць расследаванне. Дзеянням лекараў, якія абвясцілі жывога пацыента мёртвым, даецца прававая ацэнка.

КАРОТКА

- **Падзякі Прэзідэнта Беларусі за выдатную вучобу ўдастоены ваенныя і супрацоўнікі сістэмы МНС.**
- Сто балаў на ЦТ па фізіцы атрымалі 15 чалавек.
- **Больш за 1,2 кіламетра гандлёвых радоў разгорнуцца на свяце «Купалле» ў Александрыі.**
- У Беларусі прыняты дадатковыя меры па стымуляванні адстрэлу дзікоў.
- **Сяргей Раўнейка, які працаваў памочнікам Прэзідэнта Беларусі — інспектарам па Гродзенскай вобласці, прысуджаны да 12 гадоў калоніі за хабар.**
- Семярых маленечкіх вожыкаў знайшлі на ўскраіне Віцебска і перадалі ў мясцовы заапарк. Трое з іх аказаліся рэдкімі вожыкамі-альбіносамі.



Усяго праз некалькі дзён насельніцтва Віцебска істотна павялічыцца за кошт гасцей і ўдзельнікаў XXVIII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар». Афіцыйнае адкрыццё форуму адбудзецца 11 ліпеня, але фестывальныя мерапрыемствы пачнуцца на некалькі дзён раней, з 8 ліпеня.

Імянную зорку на зорнай плошчы каля Летняга амфітэатра сёлета замацуюць у гонар народнай артысткі Украіны Таісіі Павалій. Менавіта яна стане ўладальніцай спецыяльнай узнагароды Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення».

Маладыя выканаўцы з 18 краін, удзельнікі «базарнага» конкурсу, выступяць не толькі ў Віцебску, але і ў Жодзіне — у зборачным цэху аўтазавода «БелАЗ». І гэта, як напаўжартам зазначае **кіраўнік дырэкцыі «Славянскага базару ў Віцебску» Глеб ЛАПІЦКІ,** стане ўнёскам фестывалю ў пашырэнне экспартных паставак. А 21 юнаму канкурсанту пакажуць фабрыку «Віцьба» і калыску беларускай дзяржаўнасці — Полацк.

ФЕСТЫВАЛЬ БЕЗ ВІЗ І МЕЖАЎ

Дарэчы, сярод змен, якія адбыліся сёлета ў праграме конкурсу эстраднай песні «Віцебск», — не толькі скарачэнне паўфіналу, але і з'яўленне пастанцоўкі падчас выступленняў удзельнікаў. Харэаграфічны складнік забяспечвае не хто-небудзь, а адзін з самых вядомых у Еўропе калектываў — шоу-балет «Тодэс».

СТАР. 3

Фота БелТА.

ISSN 1990 - 763X

Няма права на памылкі

Наталля КАЧАНАВА даручыла актывізаваць работу па вырашэнні праблем Аршанскага рэгіёна

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта ўдзельнічала ў пазачарговым выязным пасяджэнні Віцебскага аблвыканкама па развіцці Аршанскага раёна. Работа па асваенні рэсурсаў, выдзеленых на рэалізацыю мераприемстваў, на яе думку, вядзецца неналежным чынам. Кіраўнік кожнага ўзроўню павінен адчуваць асабістую адказнасць за выкананне даручэнняў у сельскай гаспадарцы, па нарыхтоўцы кармоў, навядзенні парадку на зямлі, у прамысловым комплексе і іншых сферах.

«Па Аршанскім раёне прыняты такія меры падтрымкі і праграма, якіх няма ні ў якіх іншых рэгіёнах. На яго прыкладзе мы хочам паказаць, як працуюць гэтыя прафесіянальі. Аднак на сённяшні дзень няма чаго паказаць, што служыла б яркім прыкладам для іншых гарадоў. Чаканыя вынікі пакуль не дасягнуты, тэмп асваення інвестыцый нязначны», — сказала Наталля Качанава.

Некаторыя пазітыўныя зрухі ў развіцці Аршанскага краю ўжо ёсць, адзначыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта, але рэалізоўваюцца прынятыя падпрограмы павінны больш хуткімі тэмпамі.

«Чамусьці яшчэ ідзе некаторае разгойдванне. Гэта недапушчальна, балакаты ў такіх пытаннях быць не павінна. На мой погляд, гэта проста недапрацоўкі кіраўнікоў альбо, калі гэта камунальныя праблемы, — мясцовых органаў улады, калі распубліканскія — то распубліканскіх. Што датычыцца апошніх, то мы трымаем на кантролі ўсе праекты, але, на жаль, тэмпы рэалізацыі не задавальняюць», — падкрэсліла Наталля Качанава.

Анансавала яна і вялікую нараду па развіцці гарадоў з насельніцтвам звыш 80 тысяч чалавек у верасні. Першы адказ за рэалізацыю праграм будзе трымаць старшыня Аршанскага райвыканкама Ігар Ісаканка.

Паводле БелТА.

У космас без... ракет

Адбылася другая міжнародная навуковая канферэнцыя па бязракетнай індустрыялізацыі космасу

Як і першая, што прайшла яшчэ ў 1988 годзе, яна сабрала пад Мінскам шмат гасцей — навукоўцаў, практыкаў, выхаванцікаў з дзясяткаў краін свету. Бо за апошні час тэма стала яшчэ больш актуальнай.

Неабходнасць маштабнай індустрыялізацыі космасу абумоўлена глабальнымі экалагічнымі (і не толькі) праблемамі, з якімі сутыкнулася чалавецтва. Удзельнікі канстатавалі: у біясферы Зямлі адбываюцца негатыўныя змены, выкліканыя дзейнасцю сучаснай тэхнакратычнай цывілізацыі. Калі не прыняць дзейных мер, наступстві будуць незваротныя.

Рашэнне прапанаваў асноўны дакладчык — **беларускі інжынер і вынаходнік Анатоль ЮНІЦКІ, член Федэрацыі касманаўтыкі СССР,** стваральнік тэхналогіі струннага транспарту, да якой сёння праяўляюць цікавасць у дзясятках краін. У тым ліку ў Аб'яднаных Арабскіх Эмірастах, дзе праект уключаны ў стратэгію інфраструктурнага развіцця.

Ён расказаў аб сваёй касмічнай праграме SpaceWay, сутнасць якой заключаецца ў тым, каб вынесці ўсю шкодную выторчасць на арбіту Зямлі і начаць індустрыялізацыю космасу. Але традыцыйныя метады для рашэння гэтай задачы не падыходзяць. «Ракетны транспарт, што існуе сёння, наносіць велізарную шкоду экалогіі і эканамічна не эфектыўны. У індустрыялізацыі космасу вырашальную ролю павінен адыграць геакасмічны транспарт новага пакалення», — падкрэсліў Анатоль Юніцкі.

Юніцкі прадставіў праект агульнапланетарнага транспартнага сродку (АТС) — геакасмічны транспарт будучага, які будзе выгадна адрозніваца ад сучасных ракетных рашэнняў высокай хуткасцю, экалагічнасцю (працуе на электрычнасці) і эфектыўнасцю. У перспектыве АТС — а гэта гігантскі геакасмічны лятальны апарат, што ахопіць планету ў плоскасці экватара, — зможа забяспечваць штогадовы грузапаток у мільёны і нават мільярды тон паміж Зямлёй і арбітай. Пры гэтым затраты на такое перамяшчэнне складуць меншы кг тысячу долараў за тону. А чалавецтва атрымае доступ да практычна ідэальных умоў для тэхналагічных працэсаў на арбіце: бязважкасць, вакуум, неабмежаваныя сыравінныя, энергетычныя і прасторавыя рэсурсы.

Непадробную цікавасць удзельнікаў і гасцей выклікалі даклады «Алісанне канструктыўных элементаў астранжынернай транспартнай сістэмы SpaceWay», «Асабліваці праектавання жылога касмічнага кластара «ЭкаКасмаДом», «Асабліваці міжнароднага бізнес-супрацоўніцтва ў рамках праграмы SpaceWay» і іншыя.

Ажыццяўленне праекта — звышамбіцыйная задача, рашэнне якой запатрабуе цеснага ўзаемадзеяння паміж краінамі свету, урадамі і міжнароднымі арганізацыямі, адзначаюцца на канферэнцыі. Па яе выніках будзе выдадзены зборнік навуковых прац. Наступная, трэцяя канферэнцыя па праблемах бязракетнага асваення космасу, адбудзецца налета, таксама ў Беларусі.

Ул. інф.

МІЛЬЁН НА ПРАЦЯГ ПАЧАТАК

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

— Вынік, якога мне найперш хацелася б дасягнуць, — навучыць сваіх спецыялістаў працаваць з Еўрапейскім саюзам, каб атрымліваць гранты, — прызнаўся ў гутарцы з журналістамі **старшыня райвыканкама Ігар КУЗНЯЦОЎ.** — Гэта добрая школа. Нам трэба засвоіць правілы гульні. Планы па развіцці рэгіёна не абмяжоўваюцца гэтым праектам. Галоўная наша задача — забяспечыць годным заробкам жыхароў Мёршчыны і пры гэтым захаваць экалогію.

На ўводным семінары па рэалізацыі праекта кіраўнік раёна падзяліўся найбольшай сваёй заклапочанасцю. Штогад насельніцтва рэгіёна змяншаецца, і сёння колькасць пенсіянераў ужо амаль роўная колькасці занятых у эканоміцы.

Яшчэ адна праблема — нізкая прадпрымальніцкая актыўнасць. Людзі на Мёршчыне жывуць таленавітыя, неардынарныя, гасцінныя і працавітыя. Але адкрыць сваю справу рашаюцца і маюць магчымасць нямногія. Банкі выдаюць крэдыты на развіццё малога бізнесу з умовай наяўнасці ўласнага капіталу, аднак ён ёсць далёка на ва ўсіх. Доля малых і сярэдніх прадпрыемстваў у даходнай частцы мясцовага бюджэту за апошнія восем гадоў патроілася і дасягнула 22 працэнтаў, але сярод такіх арганізацый прыватных нязначная колькасць.

Разам з тым Мёршчына цяпер знаходзіцца на пароге вялікіх спадзяванняў. Восеннню гэтага года павінен запрацаваць металапракатны завод, які, як чакаецца, адразу ўдвая павялічыць мясцовую казну. У выніку з'явіцца сродкі на будаўніцтва новага садка і жыллля, на рамонт школ і дарог. Летась тут была здадзена ў эксплуатацыю цэнтральная раённая бальніца. Днямі будзе гатовая праектна-каштарысная дакументацыя на пабудову раённай паліклінікі. У планах — будаўніцтва кардыяцэнтра, на базе якога будзе таксама праводзіцца ранняя дыягностыка анкалагічных захворванняў, што вельмі актуальна для ўсёй Віцебскай вобласці. Ужо знойдзена месца для пабудовы гандлёва-забаўляльнага цэнтра з басейнам. Прынята рашэнне аб павелічэнні плошчы Мёраў для стварэння новага жылога квартала.

У гэтых абставінах увага на экалогію не залішняя. Невыпадкова еўрапейцы ўкладаюцца ў захаванне ўнікальнай прыроднай зоны на гэтай частцы канцінента. І тое, што падтрымка не аднабаковая, накіраванае не толькі на ахову прыроды, але і на фінансаванне мясцовых ініцыятыў, сацыяльную інфраструкturу, наладжванне сумеснай працы насельніцтва і ўлады (вынікам чаго павінна стаць умацаванне ўзаемаразумення і даверу), стварае падставу для захавання баланса і набыццё сапраўднай устойлівасці ў развіцці.

Балота Ельня.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Мёршчына — адзін з тых раёнаў, дзе найбольш захавалася дзікая прырода і дзе пры гэтым адбываецца развіццё. Гэта вельмі важна і для Еўропы, і для Беларусі, таму Еўрапейскі саюз пранікнуўся нашай заявай, — расказаў на семінары **дырэктар ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Аляксандр ВІНЧЭУСКІ.** — Наш праект накіраваны не толькі на тое, каб нешта змяніць тут, але і на тое, каб стаць каталізатарам для прыцягнення новых інвестыцый, кай і бізнесмены, і замежныя інвестары, і дзяржава бачылі патэнцыял раёна і ўкладалі сюды сродкі.

— Нездарма еўрапейскія падаткаплацельшчыкі падтрымалі гэты праект у Беларусі, бо для іх нашы балоты — каштоўнасць. Калі балоты знікнуць у нас, яны знікнуць для ўсяго чалавецтва, — патлумачыў **менеджар праекта Алег СІВАГРАКАЎ.** — Падыход «думай глабальна, дзейнічай лакальна» адлавядае канцэпцыі ўстойлівага развіцця. Павінен быць баланс прыроды, эканомікі і сацыяльных аспектаў. У праекце ёсць усе тры кампаненты: ён накіраваны на ашчаднае выкарыстанне патэнцыялу балот, на павышэнне якасці жыцця мясцовых людзей і на падтрымку малога бізнесу.

Важна, што праект ажыццяўляецца на ўзроўні не самага вялікага раёна, не самага населенага, падкрэсліў Алег Сівагракаў: «Зараз ва ўсім свеце звяртаецца ўвага на тое, што якраз у такіх месцах знаходзяцца добрыя эканамічныя і сацыяльныя рэзервы. Мы чакаем удзелу людзей».

Дарэчы, амаль 20-гадовая гісторыя руху па ўстойлівым развіцці ў Беларусі пачыналаса менавіта ў Мёрскім раёне — у самым малым горадзе краіны Дзісне. У 2000 годзе тут была прынятая першая стратэгія ўстойлівага развіцця, у якой горад раённага падпарадкавання Дзісна аб'ядноўваўся з чатырма сельсаветамі. Прыклад падштурхнуў многія іншыя раёны і гарады краіны. На сённяшні дзень ужо каля 50 такіх стратэгій апубліkаваныя, многія рыхтуюцца.

Цяпер распачынаецца праца на стварэнні стратэгіі ўстойлівага развіцця ўсяго раёна. «Стратэгія — таму што мы спрабуем развіваць усё разам, комплексна і сістэмна, — падкрэсліў менеджар праекта. — У латвійскім Дайгаўпілісе муніцыпалітэт штогод падае на конкурс Еўрапейскага саюза каля 70 заявак, прыкладна каля 20 з іх атрымліваюць грошы. Для мясцовай супольні гэта крыніца і інструмент здабыцця сродкаў на развіццё. Яны гэтаму шмат навучаліся, шмат бачылі прыкладаў у іншых краінах Еўрасаюза. У нас такіх магчымасцяў пакуль няма, але я звяртаюся да ўсіх жыхароў Мёршчыны: калі ласка, успрымайце наш праект як патэнцыял таго, што вы можаце прыйсці ў офіс, пазнаніць нашым супрацоўнікам, звяжацца з «Аховай птушак Бацькаўшчыны» і прапанаваць нешта, запытаць нешта, разам нешта зрабіць».

Значнае месца ў праекце надаецца праспоўванню мясцовага брэнда «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю». Фестываль пад такой назвай з 2012 года кожную восень збірае людзей не толькі з раёна і вобласці, але і з усёй краіны, вядомы ён і замежным аматарам аргазэктатурызму. На Ельні збіраецца самы вялікі ў Беларусі ўраджай дзікарослых журавін, а гэтыя ягады, як вядома, лічацца медыкамі адным з самых карысных прадуктаў харчавання. Падчас фестывалю журавіны тут можна набыць па найбольш выгаднай цане.

Акрама таго, увосень сюды злятаецца больш за 30 тысяч жураўлёў, а таксама гусі і іншыя пералётныя птушкі, якія на працягу некалькіх тыдняў харчуюцца на мясцовых палях і набіраюцца сіл на балоце, перад тым як працягнуць далейшы шлях у вырай.

Ельня — само па сабе вельмі прыцягальнае ў турыстычным плане месца, тут маецца экалагічная сцежка, распрацаваныя экскурсіі. Аднак пакуль ні любімы многімі фестываль, ні ўнікальнае балота не сталі для раёна значнымі крыніцамі прыбытку. Каманда праекта «Разам для грамады і прыроды...» спадзяецца змяніць гэтую сітуацыю.

«Мясцовы брэнд «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю» — эканамічны рухавік, бо ў бізнесе цяпер галоўнае не хуткасць і аб'ёмы выторчасці, а цікавая ідэя, адрозносць. Калі ў вас ёсць тое, чаго нідзе няма, вы пераможаце, — упэўнены Алег Сівагракаў. — Тое самае ў турыстырыльным развіцці. Мы паспрабуем распрацаваць такую мадэль, якая дазволіць навучаць іншыя раёны, і не толькі ў Беларусі».

Што датычыцца сацыяльнага кірунку, праект прадугледжвае набыццё аўтамабіля хуткай дапамогі, будаўніцтва спартыўных і турыстычных аб'ектаў, добраўпарадкаванне раённых пляжаў і «Паўэстрава» — галоўнай пляцоўкі горада для правядзення масавых мерапрыемстваў. А таксама будаўніцтва назіральных вышак, абсталяванне двух кемпінгаў, падаўжэнне існуючай экалагічнай сцежкі «Азяраўкі—Ельня» і іншае.

200 тысяч еўра будзе выдзелена на 10 мясцовых ініцыятыў, дзе два праекты атрымаюць па 60 тысяч еўра, астатнія — па 10 тысяч. Паводле задумы, гэта паслужыць штуркоўм для развіцця прадпрымальніцтва на Мёршчыне для таго, каб тыя, хто мае цікавыя ідэі, атрымалі магчымасць іх рэалізаваць і сталі прыкладам для іншых. Конкурсная працэдура будзе праводзіцца па правілах Еўрапейскага саюза, і ўжо вось-вось будучага года пераможцы атрымаюць грошы.

Вялікая ўвага ў праекце надаецца навучанню. Па сутнасці, гэтаму будзе прысвечаны ўвесь першы год яго рэалізацыі. Маецца на ўвазе і навучанне пошуку дадатковых рэсурсаў, і выбару тых кірункаў развіцця, якія могуць быць падтрыманы донарамі альбо інвестарамі.

Дзеля гэтага запланаваны шматлікія семінары, трэнінгі, інфармацыйныя сустрэчы, шэраг прыродаахоўных і адукацыйных мерапрыемстваў для валанцёраў, экскурсаводаў, майстроў, мясцовых жыхароў, фермераў, гаспадароў аграэкасядзіб і іншых зацікаўленых асоб. З мэтай вывучэння найлепшых практык у галіне ўстойлівага развіцця запланаваны інфармацыйна-навучальныя паездкі па Беларусі і ў краіны ЕС.

Асноўныя дасягненні праекта плануецца шырока асвятляць у СМІ і на вэб-сайце праекта.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,

г. Мёры.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат», в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А. в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже имущества в составе:

№ Лота	Наименование объекта	Инвентарный номер согласно данным бухучета	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Размер задатка (10 %), бел. руб.
	Технологическое оборудование для производства плодово-ягодных вин, вспомогательное оборудование и транспортные средства			
1	Ленточный пресс «Единство»	ЦС000302	**128 000,00**	12 800,00
2	Стерилизатор паровой ВК-75-01, 2007 г. в., заводской № 175	Л001127	**3 240,00**	324,00
3	Измерительная система «АЛКО-1-50-10-0,7 бет», заводской № 6090162	0001101	**2 430,00**	234,00
4	Реактор варочный М3С-210	1032	**2 340,00**	234,00
5	Полуприцеп-цистерна изотермическая на шасси МАЗ – 938020-1011, емкость цистерны 10 м куб., регистрационный знак отсутствует, цвет – серый, номер кузова (рамы) не читается	0001025	**4 230,00**	423,00
6	Автомат для наклейки акцизных марок К2-МНА-6-01, заводской № 970024	ЛР01220	**3 780,00**	378,00
7	Разгрузчик автомобильный У-15-УРАГ	ЦПВ0002	**2 970,00**	297,00
8	Разгрузчик автомобильный У-15-УРАГ-У	ЦПВ0002	**4 200,00**	420,00
	Емкостное хозяйство:			
9	Емкость из нержавеющей стали, V = 3 м куб.	Числится на счете 08 «Вложения в долгосрочные активы»	**2 700,00**	270,00
10	Сборник для сока, V = 2 м куб.	0001175	**2 340,00**	234,00
11	Емкость горизонтальная стальная, V = 71.9 м куб.	0001008	**2 520,00**	252,00
12		0001009	**2 520,00**	252,00
13		0001011	**2 520,00**	252,00
	Транспортные средства:			
14	**Автомобиль грузовой бортовой тентовый МАЗ-533605**, 2006 года выпуска, цвет – белый, регистрационный знак АН 7071-5, кузов (рама) № Y3M5336050600068З, свидетельство о регистрации ДТС ОАА № 273421 от 15.11.2013, расположен по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21	0001095	**2 100,00**	210,00
15	**Автомобиль грузовой бортовой тентовый МАЗ-533605-221**, 2006 г. в., регистрационный знак АЕ 7799-5, цвет белый, кузов (рама) № Y3M5336056000070Ч	0001095	**2 520,00**	252,00
16	**Микроавтобус грузопассажирский вагон RENAULT TRAFIC 2.0 16V**, 2008 г. в., регистрационный знак АЕ 8855-5, цвет светло-синий, кузов (рама) № VF1JLJW868 Y271249	0001169	**14 940,00**	1 494,00
17	**Автомобиль легковой седан VOLKSWAGEN PASSAT 2.0 FSI**, 2007 г. в., регистрационный знак 0027 ВН-5, цвет серебристый, кузов (рама) № WVWZZZ3CZ8P007512	0001113	**7 020,00**	702,00
18	**Автомобиль грузовой фургон VOLKSWAGEN CADDY CASTEN MAXI 2.0 TDI**, 2008 г. в., регистрационный знак АІ 3355-5, цвет синий, кузов (рама) № WV1ZZZ2KZ9X042835	0001185	**8 370,00**	837,00
	Оборудование:			
19	Сепаратор для соков ГЗ-КОВ, заводской № 2001	0001118	**4 900,00**	490,00
20	Моечная машина Ш12-КМО	ЦПВ0202	**8 600,00**	860,00
21	Аппарат розлива и упаковки жидких продуктов в картонную упаковку типа PURE PAK «Альтер-04А», 2016 г. в., заводской № 1602	Числится на счете 08 «Вложения в долгосрочные активы»	**34 380,00**	3 438,00
22	Транспортабельная котельная установка ТКУ-07Г (блочно-модульная котельная со встроенным оборудованием), 2006 г.в., заводской № 074	0001130	**28 710,00**	2 871,00
23	Гамма-радиометр «АТОМТЕХ» РКГ-АТ1320А, 2015 г. в., заводской № 21232	ЦС000294	**5 670,00**	567,00
24	Фильтр-пресс Ш4-ВФП-12, заводской № 104Р198/13 (чугун.)	ЦПВ0165	**3 690,00**	369,00
25	Комплект оборудования для выращивания грибов в составе: Программно-технический комплекс оборудования адаптивной вентиляции и микроклимата для выращивания грибов «Тургор АМ»	ЦС 000310	**29 025,00**	2 902,00
	Стеллаж	ЦС000308		
	Секция стеллажа	ЦС000309		
	Недвижимое имущество:			
26	Магазин № 1, общ. пл. – 199,9 кв. м, инв. № 602/С-24224, расположенный на земельном участке площадью 0,0460 га с кадастровым номером 624450100001003811 по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21. В состав лота входят малоценные предметы (12 шт.), ознакомиться с перечнем которых можно у организатора торгов		**39 123,43 В том числе малоценные предметы на сумму 223,43**	3 912,00
27	**Комплекс имущества в составе:**		**1 026 692,70**	102 669,00
№ п/п	**Технологическое оборудование для производства плодово-ягодных вин, вспомогательное оборудование**			
1	Емкость РВС-50, объем = 50 м куб., заводской № В-5791	ЦПВ0012	**2 800,00**	
2	Емкость РВС-50, объем = 50 м куб., заводской № В-5790	ЦПВ0010	**2 800,00**	
3	Емкость РВС-50, объем = 50 м куб., заводской № В-5782	ЦПВ0011	**2 800,00**	
	Емкостное хозяйство:			
4	Варочный котел, Vвн = 1 м куб.	ЦПВ0042	**2 600,00**	
5	Сироповарочный котел со смесителем винтовым, V = 2 м куб.,	ЦПВ0028	**3 300,00**	
6	Сироповарочный котел (дрожанка) со смесителем винтовым, V = 2 м куб.	ЦПВ0022	**3 300,00**	
7	Аппарат бродильно-купажный Ш4- ВАК-30	ЦПВ0121	**15 000,00**	
8		ЦПВ0122	**15 000,00**	
9		ЦПВ0123	**15 000,00**	
10		ЦПВ0124	**15 000,00**	
11		ЦПВ0125	**15 000,00**	
12		ЦПВ0126	**15 000,00**	
13		ЦПВ0131	**18 600,00**	
14		ЦПВ0132	**18 600,00**	
15		ЦПВ0133	**18 600,00**	
16		ЦПВ0134	**18 600,00**	
17		ЦПВ0135	**18 600,00**	
18		ЦПВ0136	**18 600,00**	
19		ЦПВ0137	**18 600,00**	
20		ЦПВ0138	**18 600,00**	
21		ЦПВ0139	**18 600,00**	
22		ЦПВ0140	**18 600,00**	
23		ЦПВ0141	**18 600,00**	
24		ЦПВ0142	**18 600,00**	
25		ЦПВ0143	**18 600,00**	
26		ЦПВ0144	**18 600,00**	
27		ЦПВ0145	**18 600,00**	
28		ЦПВ0146	**18 600,00**	
29		ЦПВ0147	**18 600,00**	
30		ЦПВ0148	**18 600,00**	
31		ЦПВ0149	**18 600,00**	
32		ЦПВ0150	**18 600,00**	
33		ЦПВ0151	**18 600,00**	
34		ЦПВ0152	**18 600,00**	
35		ЦПВ0153	**18 600,00**	
36		ЦПВ0154	**18 600,00**	
37		ЦПВ0155	**18 600,00**	
38		ЦПВ0156	**18 600,00**	
39		ЦПВ0157	**18 600,00**	
40		ЦПВ0158	**18 600,00**	
41		ЦПВ0159	**18 600,00**	
42		ЦПВ0160	**18 600,00**	
	Оборудование:			
43	Пожарная сигнализация № 1	001177	**7 000,00**	
	Недвижимое имущество:			
44	Проходная № 1, общ. пл. – 39,3 кв. м, инв. № 602/С-24221, котельная, общ. пл. – 278 кв. м, инв. № 602/С-45284, цех первичного виноделия со спиртохранилищем, общ. пл. 1884,4 кв. м, инв. № 602/С-24220, склад хранения стройматериалов, общ. пл. 39,7 кв. м, инв. № 602/С-56728, расположенные на земельном участке площадью 1,3081 га с кадастровым номером 624450100001003812 по адресу: Минская область, Пуховичский район, г. Марьина Горка, ул. Калинина, 21		**319 400,00**	
	Малоценное имущество:			
45	Малоценное имущество (90 шт.). С перечнем можно ознакомиться у организатора торгов		**34 692,70**	

Шаг аукциона — 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 — 3 (три) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2—15, 17—20, 23, 24, – 10 (десять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 16,21,22,25,26 – 5 (пять) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 27 – 1 (один) процент от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств и иных административно-территориальным единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течении шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, — доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется условиями о проведении торгов, ознакомиться с которым можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rfi.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 28.11.2018, 13.04.2019, 01.06.2019.

Аукцион по лотам №№ 1—25 (повторный) состоится **22 07.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.07.2019** до **16.00** по указанному адресу.

Аукцион по лотам №№ 26, 27 состоится **06.08.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **05.08.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

ОАО «Светлогорскпромстрой» уведомляет о проведении открытых повторных электронных торгов на электронной торговой площадке по реализации имущества по адресу www.torgi.gov.by по продаже имущества:

Извещение о проведении открытого аукциона по продаже имущества

№ лота	Описание	Начальная цена, бел. руб. (в том числе 20 % НДС)	Шаг аукциона (5 %), бел. руб.	Задаток (10 %), бел. руб.
1	Экскаватор колесный ЭО-33211, 2000 год выпуска, двигатель ЯМЗ-238 № 079212360, технически исправен	3 950,00	197,50	395,00
2	Автомобиль грузовой самосвал МАЗ-5551А2, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M5551A280001318, цвет белый, технически исправен	10 980,00	549,00	1 098,00
3	Автомобиль грузовой бортовой МАЗ-5336А5-320, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M5336A590000339, цвет белый, технически исправен	9 790,00	489,50	979,00
4	Автомобиль грузовой специальный автокран МАЗ-5337 А2 КС-45729А-4-02, 2009 года выпуска, кузов (рама) Y3M4572A490000280/ Y3M5337A290001630, цвет желтый, технически исправен	40 270,00	2 013,50	4 027,00
5	Автобус-вагон МАЗ 256280, 2008 года выпуска, кузов (рама) Y3M25627080001223, цвет синий, технически исправен	21 950,00	1 097,50	2 195,00
6	Автобус специальный фургон ГАЗ-3309 ВМ-32841, 2008 года выпуска, кузов (рама) XWX32841C80000097, цвет белый, технически исправен	5 540,00	277,00	554,00
7	Автомобиль грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 АЗ-372-50, 2010 года выпуска, кузов (рама) Y3BSMB372A0000219, цвет белый, технически исправен	23 190,00	1 159,50	2 319,00
8	Автомобиль грузовой специальный автобетоносмеситель МАЗ 6303 АЗ-372-30, 2009 года выпуска, кузов (рама) Y3BCME37290000097/ Y3M6303A390001007, цвет белый, технически исправен	23 190,00	1 159,50	2 319,00
9	Автобус-вагон УАЗ 2206, 1998 год выпуска, двигатель ЯМЗ-238 кузов (рама) W0082285, цвет светло-серый, технически исправен	1 004,40	50,22	100,44
10	Прицеп бортовой МАЗ 837810 042, 2008 год выпуска, кузов (рама) Y3M837810800121О3, цвет серый, технически исправен	5 454,00	272,70	545,40
11	Грузовой седельный тягач ЗИЛ-131 НА, 1990 год выпуска, кузов (рама) 011464, цвет зеленый, технически исправен	4 212,00	210,60	421,20

Аукцион состоится 22 июля 2019 года с 8.00 до 16.00 на электронной торговой площадке по адресу www.torgi.gov.by.

Всю подробную информацию о лотах можно узнать на торговой площадке: **www.torgi.gov.by, в поиске набрав интересующий вас лот.**

Заявки на участие в аукционе в виде электронного документа направляются заявителями на электронный адрес centr@economy.gov.by с даты настоящей публикации по 19.07.2019 в рабочие дни с 9.00 до 16.00.

Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, должно пройти регистрацию на электронной торговой площадке.

Заявитель вправе изменить или отозвать заявку не позднее дня окончания срока подачи заявок, направив организатору электронных торгов уведомление в виде электронного документа.

Организатор торгов вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Продавец: ОАО «Светлогорскпромстрой».

Организатор аукциона: Председатель ликвидационной комиссии ОАО «Светлогорскпромстрой».

Задаток блокируется в момент первой ставки участника на лот. Участник может отозвать свою ставку (вернуть задаток), только если его ставка «перебита» другой, более высокой, ставкой другого участника. При этом информация о сделанной ставке такого участника остается в системе и сохраняется в протоколе торгов.

Задаток перечисляется на р/с Республиканского унитарного предприятия «Информационный центр Министерства экономики Республики Беларусь» BY88 BELB 3012 0027 8700 2022 6000 ОАО «Банк БелВЭБ», БИК: BELBBY2X, УНП: 190318109, ОКПО: 37533622. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по лоту (указывается № личного кабинета). Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается по окончанию аукциона в личный кабинет.

Победителем электронных торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победителем электронных торгов в течение пяти дней со дня проведения электронных торгов возмещаются фактические затраты, связанные с их организацией и проведением, согласно прейскуранту, находящемуся по ссылке https://torgi.gov.by/assets/docs/priceList/preyskurant.docx.

Победитель электронных торгов обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения электронных торгов.

В случае если на участие в электронных торгах подана только одна заявка или на электронных торгах не было объявлено ни одной ставки, организатор электронных торгов составляет протокол об объявлении электронных торгов несостоявшимися.

При наличии на электронных торгах только одной заявки организатор электронных торгов направляет по электронной почте единственному участнику предложение о приобретении предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов, с указанием срока для возмещения затрат, связанных с организацией и проведением электронных торгов.

Ознакомиться с объектом аукциона можно в дни приема документов на участие в аукционе у продавца. Контактное лицо для осмотра объектов: +375 44 75-65-874, тел./факс 8-(02342) 2-08-08.

С правилами торгов можно ознакомиться по адресу **https://torgi.gov.by/info/auction-rule**

Інвестыцыі

«МЛЫН ПОСПЕХУ» — ШЛЯХ ДЛЯ КАНСТРУКТЫЎНЫХ ДЭЙ

На XI Міжнародным інвестыцыйным форуме прэзентавалі яшчэ адзін форум — па ўстойлівым развіцці Магілёўскай вобласці

«Млын поспеху» — вельмі добры фармат, каб прыцягнуць да рэгіёна ўвагу бізнесменаў і дзелавых людзей з усяго свету. Пабывалі там і карэспандэнты «Звязды».

ЗАЯВІЦЬ ПРА СЯБЕ

На выстаўцы ў Палацы культуры вобласці было не праціснуцца. Адны дэманстравалі свае магчымасці, іншыя знаёміліся і задавалі пытанні.

Вунь кітайская каманда ў лыжных кашулях рэкламуе... беларускі лён. Высвятлілася, што зусім яшчэ маладое прадпрыемства кітайскага інвестара — яно пачынае сваю дзейнасць у Крычаве пад назвай ТАА «Жаныя Саюз» — збірацыца стварыць на тэрыторыі раёна комплекс па вырошчванні і перапрацоўцы лёну. Сёлета былі засеяны першыя гектары, але інвестар ужо паклапаціўся, каб заявіць пра сябе.

— Мы першы год на рынку, і нам важна, каб пра нас ведалі, — кажа **намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях ТАА «Жаныя Саюз» Андрэй ГАРАВІКОЎ.** — Шукаем партнёраў і сябе рэкламуем. Да нас падыходзяць, цікавяцца. Такія формы, як інвестфорум, вельмі зручныя, тут збіраецца вялікая колькасць людзей, ёсць спадзяванні, што нас заўважаць.

Міма стала з прыгожым караваем і сапраўдныі творамі кулінарнага мастацтва прайсці было немагчыма.

— Мы расказваем, на што здольны нашы майстры, — усміхаецца **галоўны спецыяліст аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Белкаапсаюза Таццяна ПАЗНЯКОВА.** — Самі бачыце, якія прыгожыя каравай робяць нашы супрацоўнікі ў Бялыничах. Мала хто ведае, што акрамя гародніны і садавіны, а таксама дзікарослых дароў лесу, якія мы нарыхтоўваем, у нас яшчэ ёсць зверагаспадарка — нашы вырабы з футра рэкламуе ў Маскве Анжаліка Агурбаш. Дарэчы, гэтым бокам нашай дзейнасці зацікавілася прадстаўнікі Узбекістана. А яшчэ гародніной. Узбекістан — наш даўні партнёр. А ўсяго мы сяброўм з 30 краінамі і 150 рэгіёнамі Расіі.

ГРАНТЫ ЯК ГАРАНТЫЯ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

Буйныя праекты, куды ўліваюцца вялікія інвестыцыі, — гэта вядома, але вельмі добрая перспектыва ёсць і ў невялікіх ініцыятыў. На міжнародным форуме ўпершыню адбыўся рэгіянальны форум па ўстойлівым развіцці Магілёўскай вобласці. На выстаўцы дэманстраваліся стэнды цэлага шэрагу ініцыятыў, якія былі рэалізаваныя ў рамках праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі па садзейнічанні развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь. Праекты рэалізаваны, але працягваюць працаваць.

Каму сёння невядомыя слаўгарадскія сыравары? Цяпер Слаўгарадскі раён рэалізуе з прыцягненнем міжнароднай тэхнічнай дапамогі свой турыстычны патэнцыял.

— Тут мы шукаем партнёраў і расказваем пра свой вопыт, — кажа **Святлана ЯЗЕРСКАЯ, старшыня Слаўгарадскага райсавета дэпутатаў.** — Нам цікавы расійскія партнёры і магчымасць кантактаў з імі, шукаем таксама фінансаваю падтрымку, бо тут ёсць прадстаўнікі донарскіх арганізацый.

Намеснік старшыні Клічаўскага райвыканкама Аляксей ПАЛАВІКОЎ ліча, што праектная дзейнасць і прыцягненне грантаў на рэалізацыю канкрэтных ініцыятыў — вельмі добры спосаб знайсці ўстойлівасць і паступова выйсці з крызісу.

— Мы гэты курс узялі яшчэ ў 2015 годзе, — згадвае ён. — Удзельнічалі ў шэрагу праектаў ПРААН па садзейнічанні развіццю на мясцовым узроўні Рэспублікі Беларусь і іншых. Распрацавалі эканамічны план развіцця ў рамках ініцыятывы «Меры за эканамічны рост» для Сусветнага банка. Цяпер вырашылі акумуляваць усе высілкі, задзейнічаць усе сферы жыццядзейнасці і распрацаваць адзіны дакумент — стратэгію ўстойлівага развіцця. У Магілёўскай вобласці няшмат раёнаў займаецца менавіта стратэгіяй. Ня пакуль ёсць толькі ў Чавускага раёна. Цяпер над ёй працуюць наш Клічаў і Быхаў. Трэба мабілізаваць усе ўнутраныя і знешнія рэсурсы, каб дасягнуць станоўчага выніку. Мы ўжо напрацавалі шэраг кірункаў, метадык і сфармявалі курс, па якім будзем рухацца.

Такая цікавасць імпануе міжнародным каардынатарам і прыцягнае замежных донараў да вобласці.

— Літаральна ў лютым праграма развіцця ААН пры падтрымцы Еўрасаюза ў партнёрстве з Міжэканомікі запусціла новы праект, накіраваны на эканамічнае развіццё, — адзначае **Кірыл СЦЕЖКІН, каардынатар праекта Праграмы развіцця ААН у Рэспубліцы Беларусь.** — Ён нашэваецца «Падтрымка эканамічнага развіцця на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь». На тэрыторыі вобласці з'явілася два пілотныя раёны — Быхаў і Хоцімск, якія атрымаюць веды, навыкі кампетэнцыі для развіцця прыватнай ініцыятывы, малога і сярэдняга бізнесу, палепшаць інфраструктуру падтрымкі прадпрымальніцтва. Таксама будуць наўпрост падтрыманы інавацыйныя бізнес-ідэі для сацыяльнага прадпрымальніцтва і тыя асобы, якія стваральнасць рабочых месцаў і вырашаюць пытанні сацыяльнай адказнасці.

Намеснік старшыні камітэта эканомікі Магілёўскага аблвыканкама Павел МАРЫНЕНКА, у сваю чаргу, заўважыў, што карысць ад такой дзейнасці вельмі вялікая:

- выявляем и оцениваем риски существенного искажения финансовой отчетности вследствие ошибок и (или) недобросовестных действий; разрабатываем и выполняем аудиторские процедуры в соответствии с оценennыми рисками, направленные на снижение этих рисков; получаем аудиторские доказательства, являющиеся достаточными и надлежащими, чтобы служить основанием для выражения аудиторского мнения. Риск необнаружения существенных искажений финансовой отчетности в результате недобросовестных действий выше риска необнаружения ошибок в результате ошибок, так как недобросовестные действия, как правило, подразумевают наличие специально разработанных мер, направленных на их сокрытие, таких как сговор, подлог или подделка документов, умышленные пропуски, представление недостоверных сведений или нарушение системы внутреннего контроля;
- получаем понимание системы внутреннего контроля аудируемого лица, имеющей отношение к аудиту финансовой отчетности, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения аудиторского мнения относительно эффективности функционирования этой системы;
- оцениваем надлежащий характер применяемой аудируемым лицом учетной политики, а также обоснованность учетных оценок и соответствующего раскрытия информации в финансовой отчетности;
- оцениваем правильность применения руководством аудируемого лица допущения о непрерывности деятельности и на основании полученных аудиторских доказательств делаем вывод о том, имеется ли существенная неопределенность в связи с событиями или условиями, в результате которых могут возникнуть значительные сомнения в способности аудируемого лица продолжать свою деятельность непрерывно. Если мы приходим к выводу о наличии такой существенной неопределенности, мы должны привлечь внимание в аудиторском заключении к соответствующему раскрытию данной информации в финансовой отчетности. В случае если такое раскрытие информации отсутствует или является ненадлежащим, нам следует модифицировать аудиторское мнение. Наши выводы основываются на аудиторских доказательствах, полученных до даты подписания аудиторского заключения, однако будущие события или условия могут привести к тому, что аудируемое лицо утратит способность продолжать свою деятельность непрерывно;
- оцениваем общее представление финансовой отчетности, ее структуру и содержание, включая раскрытие информации, а также оцениваем, обеспечивает ли финансовая отчетность достоверное представление о лежащих в ее основе операциях и событиях.

Мы осуществляем информационное взаимодействие с лицами, наделенными руководящими полномочиями, доводя до их сведения, помимо прочего, информацию о запланированных объеме и сроках аудита, а также о значимых вопросах, возникших в ходе аудита, в том числе о значительных недостатках системы внутреннего контроля.
Мы предоставляем лицам, наделенным руководящими полномочиями, заявление о том, что нами были выполнены все этические требования в отношении соблюдения принципа независимости и до сведения этих лиц была доведена информация обо всех взаимоотношениях и прочих вопросах, которые можно обоснованно считать угрозами нарушения принципа независимости, и, если необходимо, обо всех предпринятых мерах предосторожности.
Из числа вопросов, доведенных до сведения лиц, наделенных руководящими полномочиями, мы выбираем ключевые вопросы аудита и раскрываем эти вопросы в аудиторском заключении (кроме тех случаев, когда раскрытие информации об этих вопросах запрещено законодательством или когда мы обоснованно приходим к выводу о том, что отрицательные последствия сообщения такой информации превысят пользу от ее раскрытия).

Директор,
Управляющий партнер BDO в Беларуси _____ А. Н. Шкодин

Аудитор, возглавляющий аудит _____ Н. В. Кондратьева

Дата аудиторского заключения: 17 мая 2019 года
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 17 мая 2019 года

СВЕДЕНИЯ ОБ АУДИТОРЕ:

Наименование:	Общество с ограниченной ответственностью «БДО»
Место нахождения:	Республика Беларусь, 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 103, 8-й этаж, помещение 7
Сведения о государственной регистрации:	Свидетельство о государственной регистрации выдано Минским городским исполнительным комитетом от 15 ноября 2013 года
УНП:	190241132

Извещение о проведении 6 августа 2019 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «БЕЛРЫБА»

№ предмета торгов	Предмет торгов (наименование и состав продаваемого имущества)	Местонахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов (бел. руб. без учета НДС)	Размер задатка (бел. руб.)
1	Легковой джип JEEP GRAND CHEROKEE, гос. номер 0006 IH-7, 1999 года выпуска, заводской номер 1J4GW58NXYC134626, инв. № 004.00.08.2158	г. Минск, пер. Стебенева, 2	7 000,00	700,00
2	Изолированное нежилое помещение склада общей площадью 410,4 кв.м с инв. № в ЕГРНИ 640/D-29388; склад — автоперф. Н-13 Х 32-S3KA; весы электронные BW 150; весы электронные BTM-300; камера ХХН 31.21; кондиционер SM 226 SR (R-404A); кондиционер SB 331 SF (R-404A); кондиционер SB 331 SF (R-404A); кондиционер ACS-247 HR; контейнер холодильный CARRIER; система ком. учета электроэнергии (внутр. проводки) на складе; система КХН 6.61; система СБ 211 С; шкаф холодильный серии «Рапсодия» R 1400 M	г. Слуцк, ул. Базарная, д. 53 (складское помещение)	98 101,78	9 800,00
3	Торговое помещение (магазин) общей площадью 212,2 кв. м с инв. № в ЕГРНИ 633/D-3484 (Здание магазина «Нарочь», инв. № 001.00.76.1462); бонета-ларь Crystalite 20 (инв. № 004.21.07.1991); бонета-ларь Crystalite 20 (инв. № 004.21.07.1992); бонета-ларь Crystalite 20 (инв. № 004.21.07.1993); весы электронные Штрих-принт ФР4 (инв. № 004.00.08.2096); витрина холодильная «Двина» 150 ВСн-0,47-1,13-1-4Х (инв. № 004.00.09.2608); витрина холодильная «Двина» 150 ВНУ-0,3-1-О1Х (инв. № 004.00.09.2442); воздухоохладитель ЕАСМ-90Е/R (инв. № 004.04.10.3176); пожарно-охранная сигнализация «Нарочь» (инв. № 004.00.08.2087); система видеонаблюдения магазин к. п. Нарочь, (инв. № 603887); холодильная витрина 535-900-10, (инв. № 004.21.03.1552); шкаф «Polair» ШХ-0,7 ДСН (инв. № 004.21.07.1996); шкаф универсальный с дверью купе R1400VC (инв. № 004.00.08.2132); шкаф холодильный R1400 VS (инв. № 004.00.08.2184); шкаф холодильный R1400 VS (инв. № 004.00.08.2185)	Мядельский р-н, кп Нарочь, ул. Набережная, 15-1	35 571,93	3 500,00
4	Агрегат И7-ИВБ/2.00.000; Бункер со шнековым дозатором; Дозатор весовой Р6-АВМ-15; Микродозатор И7-ИЖР/4А.00; Панель измерительных приборов; Пневмотранспорт И7-ИВБ/4.; Ручная мешкозашивочная машинка; Рыбосепарат Т-ИЖС-1-01; Сепаратор ФСЦП-1/0,5; Установка мельничная И7-И; Установка насосная И7-ИЖР (2 единицы); Устройство комплектное; Цистерна д/бульона и жира; Шнек сырьевой РМУ-5.01.01; Скруббер стеклопластиковый СПК-5-1-100, Украина		264 156,26	26 400,00
5	Автомат упаковочный вертикальный ВАЭМ-1 с мультиголовочным дозатором, инв. № 120853	г. Минск, пер. Стебенева, 2	31 618,76	3 100,00
6	Весы Bizerba, инв. № 603763		1 251,00	125,00
7	Витрина холодильная «Нарочь» 1150 ВСн-0,47-1,13-1-4Х, инв. № 004.00.09.2701		1 437,01	143,00
8	Витрина холодильная «Нарочь» 180 ВН-0,63-1,47-1-О0, инв. № 004.00.09.2816		2 265,80	226,00
9	Витрина холодильная ВХС 1,5/1,1 М, инв. № 004.00.08.2124		1 491,11	149,00
10	Витрина холодильная ВХС 1,5/1,1 М, инв. № 004.00.08.2129		1 087,03	108,00
11	Головоотсекающая машина, инв. № 2017		23 409,00	2 300,00
12	Две единицы автоклава в одном модуле (2133/2134), инв. № 2133		107 649,00	10 700,00
13	Дозатор ТГ2/150, инв. № 2454		42 363,00	4 200,00
14	Дозировочно-перекручивающий автомат с формовщиком фрикаделек, инв. № 2076		27 901,01	2 700,00
15	Инъектор для посола (ручной) ПМ-ФМШ-05, инв. № 603862		1 139,00	113,00
16	Ленточная пила для мяса К3 ЭТ-К3905, инв. № 2194		4 417,03	441,00
17	Машина для закатки банок модель MVT-34/3, инв. № 2121		2 957,36	295,00
18	Машина для снятия кожицы с овощей, инв. № 2448		9 837,00	983,00
19	Машина фасовочно-упаковочная модели «ПАСТПАК-Р2», инв. № 007.14.09.2702		27 492,23	2 700,00
20	Моечные машины для овощей модель ATIR III, инв. № 2093		6 237,00	623,00
21	Мойка, инв. № 2097		978,53	97,00
22	Напольные весы с выездной рампой 1500 кг., инв. № 2014		10 010,21	1 000,00
23	Напольные весы с выездной рампой 1500 кг, инв. № 2393		10 010,21	1 000,00
24	Настольный дозатор горчично соевого раствора, инв. № 120695		5 792,51	579,00
25	Овощерезка, инв. № 2094		6 193,67	619,00
26	Овощерезка, инв. № 2447		4 510,21	451,00
27	Опрокидывающаяся жарочная установка (Опрокидывающаяся сковорода), инв. № 2068		13 581,35	1 300,00
28	Опрокидывающаяся жарочная установка (Опрокидывающаяся сковорода), инв. № 2069		13 581,35	1 300,00
29	Опрокидывающий варочный котел, инв. № 2418		23 956,34	2 300,00
30	Опрокидывающий варочный котел, вариант отопления паром, инв. № 2070		24 447,74	2 400,00
31	Опрокидывающий варочный котел, вариант отопления паром, инв. № 2071		23 956,07	2 300,00
32	Слайсер S.A.M. 308 CS, инв. № 120697		10 907,74	1 000,00
33	Установка для потрошения рыбы, инв. № 2041		8 874,00	887,00
34	Установка для сухой панировки для нанесения стандартных сортов панировочной муки, инв. № 2199		13 436,81	1 300,00
35	Установка для сырой панировки, инв. № 2197		11 339,40	1 100,00
36	Устройство для мягкой нарезки лосося, инв. № 2487		63 452,51	6 300,00
37	Устройство для нарезки полосками для листовых овощей, инв. № 2088		7 658,19	765,00
38	Устройство для нарезки полосками для листовых овощей, инв. № 2414		8 371,14	837,00
39	Устройство мягкой нарезки лосося модель WSM 100 D/A, инв. № 603836		56 513,13	5 600,00
40	Филетировочная машина 1968 для мелкой рыбы, инв. № 2019		22 469,68	2 200,00
41	Флюкс-эксцентричный винтовой насос для насадки на 200-литровую стандартную тележку, инв. № 2441		2 889,00	288,00
42	Чекопечатающее устройство, инв. № 2486		1 251,00	125,00
43	Чекопечатающее устройство (Цифровые весы), инв. № 2225		1 251,00	125,00
44	Чекопечатающее устройство (Цифровые весы), инв. № 2224		1 251,00	125,00
45	Чешуесъемная машина, инв. № 2029		630,00	63,00
46	Чешуесъемная машина, инв. № 2028		630,00	63,00
47	Шкуросъемная машина для сельди/соленой рыбы, инв. № 2406		6 382,01	638,00
48	Электронный уничтожитель, инв. № 2519		249,46	24,00
49	Электронный уничтожитель, инв. № 2518		249,46	24,00
50	Этикировочная машина-автомат предназначена для банок с резьбовыми крышками, цилиндрические — для св., инв. № 2461		32 113,91	3 200,00

Продавец имущества: ОАО «БЕЛРЫБА», пер. Стебенева, 2, 220024, г. Минск, (017) 365-79-24.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск, т. (017) 327-05-62.

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 10 (десяти) календарных дней со дня подписания протокола.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛРЫБА», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемыми имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583, не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретаемого имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 6 августа 2019 года в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 08.07.2019 по 02.08.2019 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 365-70-90 (ОАО «БЕЛРЫБА»).

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 30.07.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 50 %)

**Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 700/С-67967

Арганізм «наскрозь»

МРТ ці КТ і ў чым іх розніца?

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Магнітна-рэзанансная тамаграфія (МРТ) і камп'ютарная тамаграфія (КТ) — сучасныя апаратныя метады дыягностыкі. І той, і другі спосаб вывучае структуру тканак паслойна, а вынік даследавання пераўтварае ў серыю здымкаў, што дапамагае ўрачу дакладней паставіць дыягназ. Якія існуюць супрацьпаказанні для МРТ і КТ? Ці варта настойваць на правядзенні гэтых абследаванняў і як часта іх можна праходзіць? Ці можна рабіць МРТ, калі на целе маюцца татуіроўкі? З гэтымі і іншымі пытаннямі дапамагла разабрацца кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, загадчык рэнтгеналагічнага аддзялення медыцынскага цэнтра «ЛАДЭ» Таццяна ЛУК'ЯНЕНКА.

— Таццяна Мікалаеўна, у якіх выпадках выконваецца МРТ і КТ? У чым іх перавага над звыклымі рэнтгенам і УГД?

— Прамянёвая дыягностыка сёння мае вялікую разнастайнасць метадаў. Гэта і ўльтрагукавая дыягностыка, і рэнтгеналагічныя метады, і камп'ютарная тамаграфія, і магнітна-рэзанансная тамаграфія, і радыенуклідныя даследаванні. У тым ліку ў нашай краіне даступная гібрыдная візуалізацыя. Гэта пазітронна-эмісійная тамаграфія, сумешчаная з КТ (ПЭТ/КТ). Да кожнага з гэтых метадаў ёсць паказанні і супрацьпаказанні, гэтак жа як існуюць магчымасці і межы таго ці іншага абследавання.

МРТ і КТ — высокаінфарматыўныя метады, накіраваныя на дыферэнцыяльную дыягностыку, і выкарыстоўваюцца часта для ўдакладнення дыягназу. На першым узроўні візуалізацыі пацыент праходзіць УГД ці рэнтгеналагічнае даследаванне. Часам гэтага дастаткова, каб растлумачыць тую ці іншую сімптаматыку. Пры неабходнасці прызначаюцца КТ ці МРТ. Ёсць пералік клінічных, інструментальных, лабараторных даследаванняў, якія павінны быць выкананы, перш чым пацыент звернецца да высокатэхналагічных метадаў. І ўрачы прамянёвай дыягностыкі, і ўрачы клінічных спецыяльнасцяў працуюць строга па алгарытме — ад простага да складанага. Толькі ў рэдкіх выпадках абмінаецца першы этап і пачынаюць адразу з больш складаных метадаў. Такая практыка распаўсюджана і ў свеце.

— Ці трэба самому настойваць на правядзенні КТ ці МРТ?

— Усе віды рэнтгенаграфій, да якіх адносіцца КТ, у тым ліку КТ у стаматалогіі, суправаджаюцца прамянёвай нагрузкай, бо ў аснове метаду — крыніца іанізавальнага выпраменнення. Спецыялісты прамянёвай дыягностыкі загадзя інфармуюць пацыента і атрымліваюць яго згоду на абследаванне. Памер прамянёвай нагрузкі залежыць і ад абсталяванння. Цяпер выкарыстоўваюць пераважна шматзрэзавыя камп'ютарныя тамаграфы.

Што датычыцца МРТ, то на дадзены момант няма навукова даказаных фактаў яе шкоднага ўплыву на арганізм. Гэтае даследаванне не суправаджаецца прамянёвай нагрузкай, і ў пэўных выпадках МРТ робіцца нават дзецям.

— Колькі разоў на год можна рабіць МРТ?

— Неабмежавана.

Фота Алены КАРПУ.

— Каб абследавацца на наяўнасць, напрыклад, злаякасных пухлін, можна зрабіць КТ усяго арганізма?

— Такая працэдура не гарантуе бяспекі. У прафілактычных мэтах КТ не выконваюць, бо будуць перавышаны дозавыя прамянёвыя нагрузкі.

— З гэтых прычын многія не жадаюць рабіць і флюаграфію...

— Адназначна можна сказаць, што падчас плануемага прафілактычнага абследавання лёгкіх, што дапамагае своечасова выявіць пухліну ў боку органаў дыхання (туберкулёз, рак лёгкіх і інш.), пацыент атрымлівае мінімальную нагрузку пры максімальнай дыягнастычнай інфармацыі. Сёння ўстановы аховы здароўя набываюць сучаснае рэнтгенаўскае абсталяванне, лічбавыя апараты, якія адпавядаюць патрабаванням якасці Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Адна флюаграфія на год не перавысіць гадавую дозу прамянёвай нагрузкі. Аднак нельга забываць і аб магчымасцях КТ, якая з'яўляецца «залатым стандартам» для дыягностыкі пухлін органаў дыхання, асабліва калі маецца неадназначны клінічных і лабараторна-інструментальных дадзеных.

Магчымасці сучаснага магнітна-рэзанансных тамаграфаў дазваляюць выканаць МРТ усяго цела. Наш цэнтр, напрыклад, у хуткім часе збіраецца ўстанавіць новы апарат МРТ, пры дапамозе якога можна выканаць гэту працэдуру. Акрамя таго, ён ліквідуе фізіялагічныя артэфакты, абумоўленыя рухамі пацыента (дыхання, глытання і інш.), што вельмі важна для дыягностыкі. Калі параўноўваць з КТ ці рэнтгенаграфіяй, то МРТ усё ж дастаткова доўгая працэдура — 20—25 хвілін. Рэнтгенаграфія і КТ займаюць ад некалькіх секундаў да некалькіх хвілін.

— У якіх выпадках робіцца МРТ, а ў якіх КТ?

— Гэта вызначае спецыяліст згодна з дакладным алгарытмам. У якасці прыкладу прывяду выбар метадаў пры абследаванні галавы і шыі. Пры падазрэнні на наяўнасць аб'ёмнага пераластычнага ўтварэння, пераломах асновы і звода чэрапа, іншых траўмах, парушэннях унутрымазгавога кровазабеспячэння выконваецца КТ. У такіх выпадках, улічваючы экстранасць, гэта дае магчымасць хутка выявіць ці дыягназам. Аднак самыя ранніе змяненні пры парушэннях унутрымазгавога кровазабеспячэння магчыма выявіць пры выкананні спецыяльных МР-дыфузійных праграм (ранняй дыягностыкі інсульта).

МРТ робіцца пры анамаліях развіцця галаўнога мозга, падазрэннях на наяўнасць пераластычных утварэнняў у поласці чэрапа, рэцыдывах пасля хірургічнага і камбінаванага лячэння. Пры дэмелінізуючых захворваннях (цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэмы. — **«Зв.»**), а гэта вялікая група, пры тым жа рассеянным склерозе таксама карыстаюцца МРТ, бо КТ мае нізкую адчувальнасць. Пры сасудзістых мальфармацыях, падазрэннях на анеўрызму, стэнозах таксама робіцца МРТ з выкананнем спецыяльных сасудзістых праграм — МР-ангіяграфіі і МР-венаграфіі.

— Ці ёсць абмежаванні і супрацьпаказанні для гэтых абследаванняў?

— Што датычыцца МРТ, то ёсць пералік абсалютных і адносных супрацьпаказанняў. Сярод абсалютных — наяўнасць кардыёстымулятара, фермагнітных электронных імплантаў сяродняга вуха, іншых вялікіх імплантаў, фермагнітных сколкаў, фермагнітных іншародных цел, кроваспыняльных кліпсаў сасудаў галаўнога мозга, магчымых металічных канструкцый. Праўда, цяпер выкарыстоўваюцца пераважна тытанавыя канструкцыі, яны не з'яўляюцца фермагнітамі. У такіх выпадках мае сэнс выканаць КТ. Адносна супрацьпаказанні — інсуліновыя помпы, нервовыя стымулятары, нефермагнітныя імпланты сяродняга вуха, пратэзы клапанаў сэрца, клаўстрафобія, асабліва стан пацыента, у прыватнасці псіхаматорнае ўзбуджэнне. Перманентны макіяж, татуіроўкі не з'яўляюцца адназначным супрацьпаказаннем, але ў кожным выпадку індывідуальна мы вырашаем, ці паўплываюць яны на вынік, бо такі малюнак часам змяшчае дадатковыя мігатлівыя кампаненты, якія могуць аказацца ферамагнітамі. Кольцы для пірсінгу і іншыя металічныя ўпрыгажэнні, токаправадзячае адзенне, гадзіннікі, акуляры загадзя прапануем зняць, дастаць з кішэняў карткі і тэлефоны. Пры цяжарнасці ад МРТ лепш устрымацца ў першым і апошнім трыместрах, ад КТ — тым больш. Пры выкананні КТ тыя ж абмежаванні, што і пры рэнтгенаўскіх метадах, што звязана з дозавымі межамі.

— Ці часта даводзіцца выяўляць запушчаныя выпадкі раку? Як пра анкалагічнае захворванне паведаміць блізкім і самому хвораму?

— Казаць пра гэта заўсёды складана. Але пацыент мае права ведаць, у тым ліку каб своечасова было прызначана лячэнне, каб быў правільны алгарытм яго маршрутызацыі да спецыялістаў. Калі ёсць праблема, мы кажам пацыенту, што патрабуецца кансультацыя ўрача-анколага, заўсёды адпускаем гэта ў прататолах, каб хворы ішоў па правільным шляху.

Сапраўды бываюць познія звароты і да ўрача-клініцыста, і да ўрача прамянёвай дыягностыкі. Тут вельмі важна, каб правільна былі прызначаны метады абследавання і выконваўся алгарытм для дыягнастычнага пошуку. Гэта ўжо задача спецыяліста — правільна накіраваць пацыента на высокаінфарматыўныя метады: МРТ ці КТ або ангіяграфічныя даследаванні, у тым ліку і ПЭТ/КТ, каб хутка паставіць дыягназ і своечасова пачаць лячэнне.

Сімптом хваробы ці часовая нязручнасць?

Чаму ацякаюць ногі

Часам, асабліва ў летнюю спёку, можна заўважыць, што ногі значна павялічыліся ў памеры і басаножкі сталі цесныя. Ацёкі, як правіла, не суправаджаюць моцным болем, дастаўляюць толькі візуальны дыскамфорт. Нярэдка гэтыя сімптомы ігнаруюць, не спяшаюцца паказацца ўрачу. І дарэмна!

— Ацёчнасць можа сведчыць пра запушчаную хваробу. І, своечасова звярнуўшыся да доктара, вы можаце прадухіліць развіццё сур'ёзнага захворвання, — папярэджвае **ўрач агульнай практыкі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Марыя ШЛЫК.** — Вельмі важна вызначыць, чым выкліканы ацёкі, каб ліквідаваць першапрычыну. Найчасцей яны звязаны з варыкозным пашырэннем вен, але могуць сігналізаваць і пра іншыя непаладкі ў арганізме.

Прычына № 1 — захворванне вен

Гэта самая распаўсюджаная прычына, у прыватнасці варыкоз, стан пасля перанесенага трамбозу вен, а таксама хваробы лімфатычнай сістэмы.

Характэрнай прыкметай «вянозных» ацёкаў з'яўляецца аднабаковасць: ацякаць можа адна канечнасць. Акрамя таго, яны часта суправаджаюцца пашырэннем вен. Яшчэ адной прыкметай немачы ад хваробы вен з'яўляецца часовасць: ацёчнасць звычайна з'яўляецца ў другой палове дня і за ноч праходзіць. Калі ж ацёкі ног захоўваюцца да раніцы, прычыну варта шукаць у іншым.

Пры падазрэнні, што ногі ацякаюць ад захворвання вен, не зацягвайце, запішыцеся на прыём да флеболага, каб прайсці УГД вен. Для прафілактыкі «вянозных» ацёкаў варта прытрымлівацца бяссолевай дыеты і аптымальнага рэжыму піцця. Пастарайцеся пазбягаць доўгіх нерухомых поз і больш гуляйце пешшу. Таксама карысны будзе кампрэсійны трыкатаж.

Прычына № 2 — паталогія сэрца

Так званыя сардэчныя ацёкі ўзнікаюць найчасцей у пажылых людзей з запушчанымі хваробамі сэрца і гіпертаніяй. Характэрным маркерам ацёчнасці ад сардэчнай недастаткоўнасці з'яўляюцца сталы ўзрост і наяўнасць сардэчнай паталогіі. Пацвердзіць ці абвергнуць гэтую прычыну дапаможа праходжанне кардыяграмы і УГД сэрца.

Прычына № 3 — хваробы нырак

Адметная асаблівасць «ныркавых» ацёкаў — наяўнасць іх раніцай і ацёчнасць на твары. Да таго ж гэта заўсёды двухбаковы ацёк. Калі ў вас здарылася пераахаладжанне ці парушана функцыя мочаспускання, хутчэй за ўсё ацёчнасць выклікана хваробай нырак. Пры такіх падазрэннях рэкамендуецца зрабіць УГД нырак і здаць аналіз мачы, а таксама пракансультавацца з нефролагам ці ўролагам.

Акрамя пералічаных трох асноўных прычын, існуюць і іншыя, больш рэдкія. Напрыклад, захворванні палавой сістэмы і парушэнні работы наднырачнікаў.

Прычына № 4 — захворванні шчытападобнай залозы

Яна рэгулюе работу ўсіх залоз у арганізме. Калі шчытападобная залоза не ў парадку, магчымыя праблемы ў сістэме жаночых палавых органаў ці рабоце наднырачнікаў, што ў сваю чаргу можа быць прычынай ацёчнасці ног. Да ацёкаў могуць прывадзіць змены гарманальнага фону ў жанчын, а таксама анкапаталогія прастаты ў мужчын.

Прычына № 5 — паталогія наднырачнікаў

Адутлаватасць твару можа сведчыць ра тое, што прычына ацёчнасці заключаецца ў парушэнні работы наднырачнікаў ці нырак.

У некаторых выпадках ногі могуць ацякаць ад паталогій работы органаў некалькіх органаў, напрыклад сэрца і нырак адначасова. Гэта ўскладняе пошук першапрычыны. Таму не варта займацца самалячэннем, пры з'яўленні ацёкаў звярніцеся да доктара — прафільнага, калі заўважылі яўныя сімптомы з пералічаных, ці да тэрапеўта, калі прычына пакуль не яўная.

К@нтыненты

МОСТ ПРАЗ АТЛАНТЫКУ

Чаму Еўропа і Паўднёвая Амерыка заключылі «дамову стагоддзя»?

Еўрапейскі саюз падпісаў найбуйнейшае ў сваёй гісторыі гандлёвае пагадненне. Гэтая дамова адкрывае бізнесу Старога Свету дзверы на рынак чатырох краін Паўднёвай Амерыкі з насельніцтвам каля 300 мільёнаў чалавек. У адказ Бразілія, Аргенціна, Парагвай і Уругвай (аб'яднаныя ў субрэгіянальны гандлёва-эканамічны саюз Меркасур) атрымаюць ільготны доступ да паўмільярда еўрапейскіх спажыўцоў. Пасля 20 гадоў перамоў 28 краін ЕС пагадзіліся прыадкрыць граніцы для заакіянскага мяса і цукру ў абмен на магчымасць бяспошлінна пастаўляць у Паўднёвую Амерыку аўтамабілі, лекі, віно і сыр, перадае «Бі-бі-сі». Больш за тое, перагаворшчыкі паішлі далей і акрамя абнулення пошлін у гандлі таварамі — сельскагаспадарчымі і прамысловымі — дамовілася зняць частку нетарыфных абмежаванняў для ключавога сектара паслуг, у тым ліку дзяржзакупак, санітарных нормаў, аўтарскіх правоў. Чаму найбуйнейшыя сусветныя гульцы вырашылі дамовіцца, чаго чакаць у перспектыве?

ПАЎДНЁВЫ КРЫЖ

Меркасур (Mercado Comu'n del Cono Sur — Mercosur) — субрэгіянальны гандлёва-эканамічны саюз, у які цяпер уваходзяць Аргенціна, Бразілія, Парагвай і Уругвай. З іспанскай назва перакладаецца як «Рынак Паўднёвага конуса» — па назве часткі тэрыторыі Паўднёвай Амерыкі, размешчанай на поўдзень ад 18 градусаў паўднёвай шыраты. На эмблеме арганізацыі намаляваны сузор'е Паўднёвага крыжа. На гэтай тэрыторыі жыве больш за палову насельніцтва краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. Меркасур фарміруе каля 75 працэнтаў сукупнага ВУП Паўднёвай Амерыкі. Аб'яднанне ўяўляе сабой па памерах і эканамічным патэнцыяле другі ў свеце (пасля ЕС) мытны саюз.

Спробы развівать тэрыторыяльную эканамічную інтэграцыю на ўзор Еўрасаюза маюць доўгую, але не вельмі ўдалую гісторыю. Яшчэ ў 1960-х у Паўднёвай Амерыцы ўпершыню загаварылі пра стварэнне зоны свабоднага гандлю, а затым і цэнтральнаамерыканскага агульнага рынку. У 1960-м была створана Лацінаамерыканская асацыяцыя свабоднага гандлю (LAFTA), у якую ўвайшлі 10 краін (Аргенціна, Бразілія, Мексіка, Уругвай, Парагвай, Перу, Чылі, Калумбія, Эквадор, Венесуэла і Балівія). Аднак палітычныя і эканамічныя крызісы канца 1960-х не дазволілі ажыццявіць гэты грандыёзны праект. З прычыны моцных адрозненняў паміж дзяржавамі далейшыя спробы развіцця рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі былі накіраваны на аб'яднанне толькі некаторых краін, эканамічна найбольш блізкіх адна да адной. Так, у 1969 годзе ўнутры LAFTA ўтварылася андская група (Балівія, Калумбія, Эквадор і Чылі). Але гэтыя альянсы не здолелі дамагчыся асаблівых поспехаў у развіцці ўзаемнага гандлю.

Новая хваля ўвагі да інтэграцыйных пагадненняў паднялася ў 1980-я, калі распачаванне лацінаамерыканскіх краін у дапамозе ЗША пасля Фалклендскай вайны Аргенціны з Вялікабрытаніяй стымулявала іх цікавасць да збліжэння на рэгіянальнай аснове. У 1985 годзе прэзідэнты Аргенціны і Бразіліі — Рауль Альфансін і Жазэ Сарней — падпісалі Праграму эканамічнай інтэграцыі і супрацоўніцтва. Адной з шэрагу мер прапанавалася ўвесці выкарыстанне гаўча ў якасці валюты для рэгіянальнага гандлю. Дзве найбуйнейшыя эканомікі Лацінскай Амерыкі выключылі сумесны праект развіцця супрацоўніцтва і наступнай інтэграцыі, абвясціўшы яго адкрытым для далучэння іншых краін. Уругвай і Парагвай неўзабаве адгукнуліся на гэтую ініцыятыву. У сакавіку 1991 года ў парагвайскай сталіцы Асунсьён быў падпісаны чатырохбаковы дагавор аб стварэнні мытнага саюза і агульнага рынку. У 1995-м ён уступіў у сілу — на знешніх межах блока пачалі дзейнічаць агульныя мытныя тарыфы на імпарт тавараў з трэціх краін.

Эксперты адзначаюць, што стварэнне блока неаднойчы дапамагала стабілізаваць эканоміку краін, якія ў яго ўваходзяць. Напрыклад, у перыяд эканамічнага застою ў Бразіліі ў 1991—1993 гадах мясцовая прамысловасць здолела выжыць у значнай меры дзякуючы доступу на рынак Аргенціны, эканоміка якой у той час была на ўздыме. А ў 1994—1995-м, ва ўмовах эканамічнага спаду ў Аргенціне, выратавальным кругам для яе стаў доступ на рынак Бразіліі, які ў той час дынамічна развіваўся. Чылі, Калумбія, Балівія, Эквадор, Перу, Гаяна і Сурынам цяпер маюць статус асацыяваных членаў. Мексіка і Новая Зеландыя кваліфікуюцца як афіцыйныя назіральнікі. Таксама праводзяцца кансультацыі аб пашырэнні супрацоўніцтва з Кубай.

ГУЛЬНЯ ПА ПРАВІЛАХ

Перамовы паміж ЕС і Меркасур, у які тады ўваходзілі яшчэ і Венесуэла, пачаліся ў 1999 годзе і ішлі, мякка кажучы, не надта паспяхова. Гісторыя ўзаемадзеяння двух блокаў была напоўнена драматычнымі момантамі, калі бакі літаральна выпрабоўвалі адзін аднаго на трываласць. Двойчы (у 2004-м і 2012-м) дыялог перарываўся праз няўступлівасць еўрапейцаў у пытанні павышэння квоты на паўднёваамерыканскую сельгаспрадукцыю, асабліва на цукар і ялавічыну. Не так ужо лёгка было дамовіцца і самім членам Меркасура ўнутры арганізацыі — з прычыны розната ўзроўню развіцця прамысловасці і аграрнага сектара і часта розснакіраваных інтарэсаў. Справа дайшла да таго, што некаторыя палітолагі і эканамісты наогул казалі пра магчымы распад інтэграцыйнага аб'яднання, настолькі сур'ёзныя розногласосі выклікала пагадненне з ЕС. Гістарычны дагавор саслеў не толькі па прычыне доўгіх перамоў. Еўрасаюз, па звестках Reuters, з'яўляецца найбуйнейшым гандлёвым і інвестыцыйным партнёрам Меркасур. Летась сукупны экспарт прадпрыемстваў з ЕС склаў 45 мільярдаў еўра, адначасова з краін паўднёваамерыканскага блока ў Еўропу было пастаўлена тавараў на суму €42,6 млрд.

Другая цягам года гандлёвая мегаздзелка ЕС (калі лічыць таксама грандыёзную дамову з Японіяй) складзеная на фоне росту пратэкцыянізму ў свеце і гандлёвых войнаў паміж дзвюма найбуйнейшымі эканомікамі планеты — ЗША і Кітаем. Яна стала не толькі адлюстраваннем адрозненняў у поглядах на сусветны гандаль паміж адыходзячай Еўракамісіяй і прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам, але і доказам таго, што на заключэнне гандлёвых пагадненняў сыходзяць гады і нават дзесяцігоддзі.

«Гэта — гістарычны момант, і, паверце, я старанна выбіраю словы, — сказаў прэзідэнт Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер (дарэчы, яго паўнамоцтвы як кіраўніка ЕК завяршаюцца ў канцы кастрычніка. — **«Зв.»**). — Пагадненне сэканоміць абодвум бакам чатыры мільярды еўра пошлін у год, што робіць яго найбуйнейшым у гісторыі ЕС. Сярод нарастання напружанасці ў міжнародным гандлі мы пасылаем нашым амерыканскім партнёрам выразны сігнал пра тое, што выступаем за гульню па правілах».

Перамогі на гэтым фронце прыносяць Еўропе ачкі як у спаборніцтве за лідарства ў свеце, так і ў барацьбе за адзінства уласных эшэрагаў у кантэксце рашэння Вялікабрытаніі пакінуць ЕС. Прыхільнікі брэксіту сцвярджаюць, што ў адзіночку Лондан хутка дамовіцца з усімі краінамі аб выгадным гандлі. Праціўнікі кажуць, што ад імя найбуйнейшага ў свеце адзінага рынку ЕС дамаўляцца прасцей, ды і ўмовы лепшыя. Іх аргумент — за апошнія пяць гадоў ЕС заключыў паўтара дзясятка гандлёвых пагадненняў, у тым ліку эпахальныя здзелкі з Канадай і Японіяй.

ПАРМЕЗАН ПАД АБАРОНАЙ

Аднак урачыстае падпісанне, абмен ручкамі і папкамі з дагаворам яшчэ не азначаюць, што бяспошлінныя нямецкія BMW дадуць да Патагоніі, а бразільская ялавічына заваліць нямецкія супермаркеты. Ратыфікаваць здзелку будуць ужо іншы Еўрапарламент і іншая Еўракамісія. Да восені ўлада ў ЕС абновіцца, і ёй давядзецца зноўку дамаўляцца з незадаволенымі, перш за ўсё з фермерамі Францыі, Германіі і асабліва Ірландыі. На процілеглым беразе акіяна здзелцы пагражае ўздым левага папулізму ва ўнутранай палітыцы. Перш за ўсё ў Аргенціне, дзе на кастрычніцкіх прэзідэнцкіх выбарах прыхільнік аргентынскай эканомікі Маўрысіа Макра рызыкуе саступіць уладу праціўнікам гандлёвага пагаднення з ЕС.

Бразілія і Аргенціна наогул неахвотна дапускаюць чужынцаў на свой рынак, і пагадненне з ЕС заклікана дапамагчы ім выйсці з гавані пратэкцыянізму ў адкрытыя воды свабоднага гандлю. Да гэтага часу самай істотнай спробай было стварэнне Меркасур. Аднак за амаль 30 гадоў членам гэтай арганізацыі так і не ўдалося дамовіцца паміж сабой. Яны не змаглі стварыць ні паўнавартаснага мытнага саюза, ні адзінага рынку. Буйная здзелка з ЕС можа надаць паскарэнне кантынентальнаму гандлёваму праекту. За гэта выступае новы прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару — «трапічны Трамп» з вельмі ліберальнай эканамічнай праграмай. «Гістарычны момант! Адно з найважнейшых гандлёвых пагадненняў усіх часоў прынясе велізарную карысць нашай эканоміцы. Вялікі дзень!» — напісаў ён у «Твітэры». Яго надзеі звязаныя перш за ўсё з гатоўнасцю Еўропы прыадкрыць самы абаронены таварны рынак — сельскагаспадарчы. ЕС паабяцаў выдзеліць квоты на ялавічыну, мяса птушкі і цукар.

У адказ краіны Меркасур адменяць імпартныя тарыфы на еўрапейскую прадукцыю, якія цяпер складаюць ад 14 да 20 працэнтаў на хімікаты, прамысловае абсталяванне і лекі і 35 працэнтаў — на аўтамабілі, вопратку і абутак. І ў дадатак дазволяць бязмытны ўвоз віна, кандытарскай прадукцыі, моцнага алкаголю і сыроў, якія цяпер абкладаюцца па стаўках ад 20 да 35 працэнтаў. Адначасова паўднёваамерыканцы падпісаліся пад абаронай геаграфічных указанняў еўрапейскіх далікатэсаў: вяны забароняць мясцовым вытворцам называць свой сыр, напрыклад, пармезанам, а вяндліну — пармскай.

СКРЫНЯ ПАНДОРЫ

Яшчэ мінулай восенню прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон адмаўляўся падпісваць гэтае пагадненне, таму што Балсанару пагражаў услед за ЗША выйсці з Парыжскага кліматычнага пагаднення. Цяпер у тэкст унеслі абавязацельствы Бразіліі, якую эколагі абвінавачваюць у бяздумнай высечцы трапічных лясоў, смагацца са зменай клімату. Макрон асцярожна пагадзіўся, папярэдзіўшы, што будзе вельмі ўважліва сачыць за развіццём гэтага гандлёвага пагаднення — з прыцэлам на абарону не толькі планеты ў цэлым, але і французскіх фермераў у прыватнасці. А яны вельмі незадаволеныя. «Пагадненне з Меркасур непрымальнае, яно абярнецца нядобрасумленнай канкурэнцыяй супраць нашых фермераў і татальным падманам спажыўца. Не вязіце сюды нікому не патрэбную сельгаспрадукцыю і ежу!» — заклікаў Крысціян Ламбер, кіраўнік найбуйнейшага французскага прафсаюза работнікаў сельскагаспадарчай галіны.

У Еўропе шмат сямейных фермаў, жорсткія правілы абароны жывёл, абмежаванні на прымяненне лекаў і тэхналогій. Гэта дорага, і фермеры баяцца наплыву танней заакіянскай прадукцыі аграхолдынгаў, не абцяжараных еўрапейскімі абмежаваннямі, аднак «Бі-бі-сі». «Здзелкай з Меркасур цяпярашняя Еўракамісія адкрывае «скрыню Пандоры» падвойных стандартаў у сельскай гаспадарцы», — выступіў ад імя еўрапейскага аб'яднання фермерскіх саюзаў Copa-Cogeca яго генеральны сакратар Пека Песанен і заклікаў ЕС пераглядзець дамову пасля абнаўлення Еўракамісіі гэтай восенню.

А ў цяперашнім выглядзе пагадненне не падтрымае парламент Ірландыі, улюбёная фермерская асацыяцыя краіны. Каропўкі прыносяць Ірландыі тры мільярды еўра штогод, і яна залежыць ад выторчасці ялавічыны як нікто іншы ў ЕС. «Гэты дагавор — вынік закулісных дамоўленасцяў і паклонення перад буйнымі кампаніямі накшталт Mercedes і BMW. Іх хвалююць толькі продажы машын у Паўднёвую Амерыку. Гэта ганебная здача значнай часткі нашага самага каштоўнага рынку ялавічыны лацінаамерыканскім каўбоям і агрохолдынгам», — незадаволены прэзідэнт Асацыяцыі фермераў Ірландыі Джо Хілі.

Еўракамісія прызнала, што пагадненне «абяцае некаторыя складанасці еўрапейскім фермерам», і паабяцала выдаткаваць да 1 мільярда еўра на субсідыі.

«Каб дагавор стаў узаемавыгадным, мы будзем старанна вызначаць квоты на сельскагаспадарчую прадукцыю з краін Меркасур з мэтай выключыць рызыку яе наплыву на еўрапейскі рынак і патрушу дабрабыту фермераў у ЕС», — паабяцаў еўракамісар Філ Хоган. Так што перспектывы разгортвання найбуйнейшага сусветнага рынку пакуль пад пытаннем. Мост праз Атлантыку давоі хісткі.

Захар БУРАК.

«СПАРТАК» — АД СЛОВА «СПАРТА»

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» гутарыць з генеральным дырэктарам слыннага акцыянернага таварыства Алегам Мікалаевічам ЖЫДКОВЫМ.

— Нават не ведаю, з якой навіны пачаць. Ці з прыгожай лічбы мінулагодніх вынікаў, ці з таго, што зусім нядаўна прадпрыемства адкрыла адразу тры фірменныя магазіны ў абласным цэнтры, і не ў свайм, а ў Гродне... Вельмі сімптаматычна. Усё ж пракаментуйце для пачатку, калі ласка, мінулагоднія вынікі і заадно тое, наколькі сёлета захоўваецца тэндэнцыя стабільнасці.

— Якую прыгожую лічбу вы маеце на ўвазе? Летась у нас было шмат прыгожых лічбаў. І пакаэчыкі росту прадукцыйнасці працы, і росту заработнай платы. А свайго прадукцыі мы выпусцілі аж на 131 308 тысяч рублёў. На экспарт адгружана на 21 працэнт больш, чым летась. Вы гэта мелі на ўвазе? Я так і зразумеў. Што ж, прадпрыемства актыўна працуе як на ўнутраны, так і на знешні рынак, нарошчвае пастаўкі. Працуе рэнтабельна, атрымлівае прыбытак.

Стабільнасць работы мы захавалі і ў першым квартале. Без лічбаў і тут не абыдзеішся. Прырост па выпуску прадукцыі склаў 11,3 працэнта. Нагляджаецца рост дабаўленай вартасці. Зноў крыху вырасла зарплата. І працягваецца актыўная работа па далейшым пашырэнні сеткі фірменнага гандлю. У лютым адкрыты яшчэ адзін фірменны магазін у Мінску і запраўды адразу тры магазіны — у Гродне.

— У разліку на замежных турыстаў, Алег Мікалаевіч?

— І на замежных турыстаў, якіх тут штогод прыбаўляецца, і на айчынных аматараў «салодкага жыцця». А ўжо зусім нядаўна, у красавіку, фірменны магазін адкрыўся ў Лоеве. Падчас адкрыцця адбылася дэгустацыя новых відаў нашай прадукцыі. Дарэчы, увесь красавік усе нашы фірменныя крамы гандлявалі па зніжаных цэнах.

Не здзіўляйцеся, але да канца года мы запланавалі ўвесці ў лік дзеючых яшчэ некалькі аб'ектаў фірменнага гандлю ў абласных і раённых цэнтрах. Робіцца гэта з мэтай ахопу большай аўдыторыі спажыўцоў, вывучэння іх попыту. Адначасова ажыццяўляецца так званая акцыйная палітыка — нічога незразумелага за гэтым словам не хаваецца, а толькі тыя акцыі, скіраваныя на розныя групы тавараў, да якіх прывыклі нашы спажыўцы і ў якіх яны актыўна ўдзельнічаюць.

— Скажыце, калі ласка, ці завяршыўся на прадпрыемстве другі этап мадэрнізацыі?

— Яшчэ ў чэрвені мінулага года — увядзеннем у эксплуатацыю лініі па вытворчасці і ўпакоўцы вафельных цукеркаў і батончыкаў. Неабходнасць правядзення другога этапу мадэрнізацыі з'явілася ў сувязі з тым, што ў адным з асноўных нашых цэхаў спатрэбілася абнавіць магутнасці па выпуску вафельных цукеркаў. І тым самым завяршыць стварэнне цалкам сучаснай вытворчасці папулярнага віду прадукцыі з высокімі спажывецкімі ўласцівасцямі. Сёння на новай лініі выпускаюцца такія вядомыя ўсім віды цукеркаў, як пралінова-вафельныя «Азрафлоцкія», «Алёнка», «Чырвоная шапачка».

Гэта не ўвесь пералік нашых навінак, бо ёсць яшчэ і цукеркі «Чыа-Рыа», вафельны батончык «Шарм», распрацавана лінейка смакаў вафельнага батончыка «Smile Time». Новая прадукцыя знайшла свайго спажыўца, і ўжо сёння мы атрымліваем прыбытак ад вытворчасці гэтых прадуктаў.

— На хвілінку вернемся да тэмы рэканструкцыі. Калі гаварыць пра перавагі новага абсталявання...

— То гэта выпуск разнастайнага асартыменту на адной лініі, хуткая перанарыентацыя вытворчасці з аднаго віду прадукцыі на іншы, зніжэнне працаёмкасці, поўная аўтаматызацыя працэсаў, а гэта значыць, магчымасць адмовіцца ад ручной працы. І — узросшая якасць вырабаў. Адным словам, зараз «Спартак» з'яўляецца сучасным прадпрыемствам, што выпускае вялікі асартымент кандытарскіх вырабаў, як традыцыйных, так і мэтавай скіраванасці.

— Вы згадалі пра ўзросшую якасць. Высокая якасць прадукцыі заўсёды была моцным бокам «Спартака».

— Што дазваляе задавальняць разнастайны попыт ва ўмовах рынка, які пастаянна мяняецца. Сваю ролю адыгралі належны ўзровень арганізацыі працы і тэхналагічнага працэсу. Дабіцца таго было няпроста і нялёгка, паверце. Таму канстатую гэта з пачуццём гонару за калектыў, за нашых тэхнолагаў.

Адсюль і так шмат навінак.

— Калі можна, раскажыце больш падрабязна пра вашы «кулінарныя сакрэты».

— Калі ласка, абсалютна канкрэтна. Для задавальнення патрабаванняў і чаканняў спажыўцоў былі распрацаваны прадукты з дабаўленнем насення (зярнятак) кунжуту, ільну, семачак сланечніку (знакамітых гарбузікаў). Гэта і батончык-мюслі «Злакі з насеннем ільну», і два віды поснага пячэння: «Посныя» з насеннем сланечніку і льну, а таксама з кунжутам і льняным насеннем. Асабліваесць у тым, што ў складзе насення шмат карысных і неабходных чалавеку элементаў. У прыватнасці, вітаміны групы В — В3, В5, В6. Яны неабходны нашаму арганізму для карэктнай, скажам так, работы нервовай сістэмы, нармалізацыі сну. Ад спажывання гэтых вітамінаў залежыць і стан скуры. А мікраэлементы фосфар і селен забяспечваюць трываласць касцей і з'яўляюцца адным з найважнейшых кампанентаў здароўя і маладосці скуры.

У сваю чаргу, магній, калій — асноўныя гаранты працаздольнасці крывяноснай сістэмы. Цынк мальтыт, ізамальт і сарбіт у вытворчасці кандытарскіх вырабаў, атрымліваем не толькі прадукты для людзей, хворых на цукровы дыябет, але і нізкакаларыйныя дыетычныя прадукты з цудоўнымі смакавымі якасцямі, яны не ўплываюць на ўзровень глюкозы ў крыві і бяспечныя для зубоў.

У працяг палітыкі ў галіне здаровага харчавання прадпрыемствам сумесна з вядучымі спецыялістамі РУП «НПЦ НАН Беларусі па харчаванні» была праведзена работа па распрацоўцы і ўкараненні цэлай лінейкі батончыкаў-мюслі без дабаўлення цукру з выкарыстаннем мальтытнага сіропу. Гэта спецыялізаваная харчовая прадукцыя дыетычнага, прафілактычнага дыябетычнага харчавання, якая складаецца з сумесі аўсяных, ячменных, кукурузных шматкоў, так званай узараванай паветранай пшаніцы, сублімаваных ягад фундуку, мальтытнага сіропу з дабаўленнем кандытарскага тлушчу і іншай сыравіны. Батончыкі-мюслі з'яўляюцца крыніцай харчовых валокнаў (клятчаткі), што стымулююць работу страўніка-кішачнага тракту, паніжаюць рызыку сардэчна-сасудзістых захворванняў.

— Вы пераканаўча тлумачыце прычыны поспеху свайго калектыву, але, мне здаецца, крыху не дагаворваеце. Калі 88 гадоў назад былое кандытарскае прадпрыемства «Праўвет» перайменуюць, то не выпадкова назвалі яго так, а не інакш. Чыста на псіхалогіі, на падсвядомасці запраграмавалі ў работнікаў дысцыплінаванасць і настойлівасць у дасягненні мэты, умоннае працавець у адной камандзе. Запраўдныя згуртаваныя спартанцы, ці ж не?

— Ну, калі прапануецца такое прыгожае і крышку экзатычнае тлумачэнне нашага калектыўнага характару, то я не супраць. *(Смяецца.)*

А калі ўсур'ёз, то мы ўжо з вамі зразумелі, што ўдасканаленне вытворчых працэсаў адбываецца пастаянна, шляхам тэхнічнага пераўзбраення, рэканструкцыі і мадэрнізацыі дзеючай вытворчасці, укараненне аўтаматызаваных сістэм кіравання тэхналагічнымі працэсамі. Але сёння я хачу асобна сказаць, асобна выдзеліць пастаяннае ўдасканаленне тэхналогій. Пра што і пачынаў гаварыць. Спецыялісты прадпрыемства вывучаюць альтэрнатыўныя і новыя тэхналогіі з мэтай прымянення іх на дзеючай вытворчасці, удасканальваюць рэцэптуры, абапіраюцца на народныя, нацыянальныя традыцыі.

Не паверыце, але насенне льну садзейнічае не толькі паляпшэнню стану скуры і валасоў, але і нармалізуе вагу. Вось на што варта звярнуць увагу нашым прыгажуням.

— З мінулых нашых сустрэч ведаем, што стратэгіяй развіцця прадпрыемства ў сферы здаровага харчавання насельніцтва важнае месца адводзіцца выпуску кандытарскіх вырабаў з паніжаным утрыманнем цукру, а таксама наогул без цукру...

— Спецыялісты прадпрыемства распрацавалі рэцэптуры на вафлі дыябетычныя «Спартак» топ на сарбіце, пячэнне дыябетычнае «Спартак» з сарбітам, шакалад дыябетычнага харчавання «Спартак» горкі з ізамальтам і шакалад горкі без дабаўлення цукру.

Я вас пераканаў, не? Тады дабавім, што выкарыстоўваючы клапаніцыда аб моцным імунітэце, зноў жа прыгажосці скуры і валасоў. Так што цэлая крыніца кампанентаў для прыгажосці і маладосці.

Акрамя таго, ніякі не сакрэт, што ў зярнятках утрымліваецца раслінная клятчатка, яна паляпшае работу страўніка. Насенне льну — яго маторыку, садзейнічае ачышчэнню ад шлакаў. У іх утрымліваюцца антыаксіданты, амінакіслоты, магній, калій, тлустыя кіслоты Амега-3 і Амега-6.

мяняюцца і стандарты на нашу прадукцыю. Унясенне змяненняў у дзяржаўны стандарт СТБ 2211 «Шакалад» дазволіла выпусціць не толькі лінейку малочнага шакаладу з начынкай з нугі і розных буйныя дабаўленнямі, але і вагой 24 грамы і 90 грамаў. Гэта новы прадукт не толькі на рынку Беларусі, але і на рынках блізкага замежжа.

— Дарэчы, пра рынкі. Цяжкавата вам на іх канкураваць з буйнымі кампаніямі, якія «прапісаліся» там спрадвеку?

— Канкураваць з буйнымі транснацыянальнымі кампаніямі, з такімі гігантамі, як «Рашэн» і іншымі знакамітымі вытворцамі з Расіі, Украіны, Прыбалтыкі, весці гульню па іх правілах немагчыма, ды і не трэба. Наша прадукцыя аўтэнтычная і — непаўторная.

Кажу гэта не толькі таму, што патрыёт яе.) І яна даўно знайшла і ўтрымлівае свайго спажыўца. Не даводзіцца лішні раз казаць, што зроблена яна з высакаякаснай сыравіны.

Пра тое, што беларускія прадукты — найвышэйшай якасці, у тым ліку і кандытарскія вырабы СП ААТ «Спартак», ведаюць ва ўсім свеце. Зусім не выпадкова геаграфія паставак фабрыкі «Спартак» налічвае 25 краін блізкага і далёкага замежжа. Сярод іх такія зусім не простыя краіны-спажыўцы, як Ізраіль, Канада, Кітай. Пастаўкі ў гэтыя рэгіёны ажыццяўляюцца на пастаянной аснове, а не толькі дзеля пашырэння геаграфіі прысутнасці.

У тую ж Канаду пастаўляем сваю прадукцыю ўжо некалькі гадоў. Там у яе свая, мэтавая аўдыторыя — група асноўных спажыўцоў. Як правіла, выхадцаў з краін былога Савецкага Саюза. І вядаеце, сам гэты факт варта расцэньвать як камплімент. Былыя суайчыннікі маюць велізарны выбар кандытарскіх тавараў, якіх хочаш і чыёй хочаш вытворчасці, могуць параўноўваць, але застаюцца з намі.

— Алег Мікалаевіч, а мо справа якраз у тым, што могуць параўноўваць. І выбраць найлепшае?

— Магчыма, і так. Ва ўсякім разе, хочацца спадзявацца. Што датычыцца рынку ЗША, пра які вы пытаецеся, то тут можна смела сказаць: прадукцыя кандытарскай фабрыкі з Гомеля карыстаецца ў Злучаных Штатах Амерыкі попытам ужо больш за дзесяць гадоў. Што пацвярджаюць рэгулярныя пастаўкі і станоўчая дынаміка аб'ёмаў рэалізаванай прадукцыі.

— Калі ласка, вернемся да тэмы навінак і якасці вашай прадукцыі. Мы яшчэ не ўсё абнародавалі.

— Тут галоўная навіна вось якая: за дасягненне значных вынікаў у галіне якасці і канкурэнтаздольнасці выпускаемай прадукцыі, укараненне інавацыйных тэхналогій і сучасных метадаў менеджменту «Спартак» чарговы раз удастоены звання Лаўрэата Прэміі Ўрада Рэспублікі Беларусь — за дасягненні ў галіне якасці 2018 года. Нядаўна адбылося ўшанаванне калектыву.

Мне прыемна прыводзіць прыклады. Сярод нашых навінак — наборы цукеркаў на малочным шакаладзе (можна сказаць, цэлая лінейка) «Milk», а таксама на горкім шакаладзе «Dark». Дык вось, за падарункавы набор шакаладных цукеркаў «Асарці Milk» на 26-й міжнародны выстаўцы прадукцыі харчавання, напіткаў і сыравіны для іх вытворчасці «Прадэкспа-2019» калектыву прысуджаны дыплом лаўрэата і залаты медаль міжнароднага конкурсу «Найлепшы прадукт — 2019», праведзенага ў рамках выстаўкі.

Я ўжо ўпамінаў шакалад «White Hill» у асартыменце. Гэта белы шакалад з буйнымі дабаўкамі ў выглядзе ядра арэха міндалю і какосавай стружкі; ядра арэха фундуку і злакаў; ядра арэха фундуку і бісквітных шарыкаў. Упакоўка — пенал, 90 грамаў, сучасны еўрапейскі дызайн. Атрымаў залаты медаль «Найлепшы прадукт 2019» у Маскве.

А вось вафельныя батончыкі «Smile Time». Глазіраваныя, са смакам вяршкоў альбо шакаладу ці згушчонага малака, ванілі; black; фундук. Гандлёвая марка распрацавана вядучым расійскім брэндынгавым агенцтвам на аснове сітуацыйнага аналізу і агляду існуючых практык. Ім ж выбудавана архітэктура брэнда, яго назва, пазіцыянаванне, платформа брэнда, а таксама візуальная канцэпцыя, дызайн упакоўкі. Такая творчая садружнасць з расіянамі прынесла свой плён. На IX Міжнародным агляд-конкурсе «Інавацыі і традыцыі» 2019 вафельны батончык «Smile Time» са смакам ванілі і вафельны батончык «Smile Time» black адзначаны залатымі медалямі і дыпломамі першай ступені «За высокую якасць».

Крышку раней мы атрымалі сярэбраны медаль у конкурсе «Прадукт года — 2018» у Маскве за каробку цукерак «Сліва ў шакаладзе». І хоць бы кароткая варта сказаць пра Рэспубліканскі конкурс спажывецкіх пераваг «Прадукт года».

«Прадукт года» з'яўляецца першай і найбуйнейшай у свеце незалежнай грамадскай прэміяй як для тых тавараў, якія ўжо зарэкамендавалі сябе на рынку, так і для інавацыйных. Гэта конкурс, які праводзіцца метадам нацыянальнага апытання спажыўцоў. Міжнародны конкурс спажывецкіх пераваг «Прадукт года» і яго прыкметны Знак служаць стандартам даверу спажыўцоў з 33 краін свету, і іх колькасць пастаянна расце.

Вынікі XX Рэспубліканскага конкурсу спажывецкіх пераваг «Прадукт года — 2018» чарговы раз пацвердзілі, што большасць беларускіх спажыўцоў выбіраюць кандытарскія вырабы ад фабрыкі «Спартак». А фабрыка ўзнагароджана Дыпломам 1-й ступені ў намінацыі «Шакаладныя вырабы» за набор цукерак «Віва Грацыёза» (175 г).

Таксама «Спартак» перамог у наступных намінацыях:

1-е месца — «Шакаладныя вырабы»; 1-е месца — «Здаровае харчаванне»; 1-е месца — у намінацыі «Пячэнне».

Знайшлі сваіх аматараў і чакаюць заслужаных узнагарод разнастайных выставак «Злакі з трускалкамі», «Злакі з чарнічамі» — гэта батончыкі з сумесі аўсяных і мультызбожжавых шматкоў, пшанічнага вотруб'я з натуральнымі дабаўкамі і іншая наша смачная і карысная прадукцыя. Дарэчы, нядаўна мы прымалі ўдзел у выстаўцы FoodExpo Kyrgyzstan 2019, якая праходзіла ў Бішкеку, Кыргызстан. Гэта было ўнікальнае галіновае мерапрыемства, якое ахапіла ўвесь харчовы рынак. Удзельнікі мелі магчымасць паказаць сваю прадукцыю найбольшай колькасці кліентаў з краін СНД, знайсці дзелавых партнёраў, заключыць дойгатэрміновыя дагаворы.

Мы таксама вярнуліся з новымі дагаворамі і ўзнагародамі. Традыцыя перамагаць, якая фарміравалася дзесяцігоддзямі, працягваецца. Зусім нядаўна мы адзначылі 95-годзе свайго калектыву. Як сустракалі? Сціпла, але прыгожа. Вы ж ведаеце, як прыгожа мы ўмеем сустракаць святы. Як працуем, так і святкуем.

Гутарыў Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ.

Здымкі прадастаўлены аддзелам маркетынгу прадпрыемства.

УНП 400078278

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 24 (466)

На адкрытай прасторы

ЗОЯ НА ЗОЮ

Экспазіцыя праекта «Мастак і горад» гатовая да перамен

Выстаўка пад адкрытым небам «Зоі» штогадовага праекта «Мастак і горад» на будучым тыдні поўнасцю памяняецца — 10 ліпеня на плошчы Якуба Коласа карціны Зоі Літвінавай у суправаджэнні адмысловага silent-кінапаказу заменяць работы Зоі Луцэвіч.

10 ліпеня арганізатары запрашаюць на творчую акцыю Cinemascope — пераэкспазіцыю і прымеркаваны да яе паказ аднаго з найлепшых анімацыйных фільмаў мінулага стагоддзя «78 абаротаў» Жоржа Швіцгебеля, які наведвальнікі будуць глядзець з дапамогай бесправадных навушнікаў.

«Мастак і горад» ужо восьмы год выносіць найлепшае беларускае мастацтва за межы фондаў, выставачных прастор і галерэй: на плошчы Якуба Коласа ўжо былі паказаныя Марк Шагал, Казімір Малевіч, Мікалай Селяшчук, Валянцін Губарэў, Георгій Скрыпнічэнкады іншыя.

Сёлета праект упершыню факусуецца на жаночым мастацтве, прадстаўляе сябе ў Брэсце (летась выстаўка ездзіла ў Віцебск) і ўключае дзве часткі. Наяўнасць двух складаў не проста становіцца намінальнай фішкай восьмага сезона: з пераэкспазіцыі робіцца адмысловая дзея, якая да выяўленчага далучае іншыя віды мастацтва, у прыватнасці кінамастацтва.

За адным захадам нагадаем, што праект Cinemascope апроч паказу Швіцгебеля на плошчы Якуба Коласа арганізуе штогадовы open-air фестываль нямога кіно і сучаснай музыкі «Кінемо» — 11 ліпеня ў дворыку музея-майстэрні Заіра Азгура з «Прыгодамі пайрубля» Акселя Лундзіна адбудзецца апошні паказ сёлетняга фэсту.

Што да экспазіцыі «Мастак і горад», то за восем гадоў яна стала неад'емнай часткай градскай прасторы, што прыцягвае як жыхароў, так і гасцей сталіцы, да таго ж знаёміць з бяспрэчнымі лідарамі нацыянальнага культурнага асяродку.

Такім чынам, 10 ліпеня замест выстаўкі «Зоя Літвінава. Выбранае» запрацуе «Перавернутая рэальнасць» Зоі Луцэвіч і затанецуе ў сталіцы да канца лета, пасля чаго пераедзе ў Брэст святкаваць тысячагоддзе горада.

Зоя Літвінава і Зоя Луцэвіч — вядомыя мастачкі як у Беларусі, так і за мяжой, дзе іх работы перыядычна выстаўляюцца, а таксама набываюцца для прыватных калекцый. Зоя Літвінава з'яўляецца ўладальніцай французскага ордэна «За заслугі ў галіне літаратуры і мастацтва» і айчыннага ордэна Францыска Скарыны. Зоя Луцэвіч сярод іншых замежных гарадоў выстаўлялася, напрыклад, у штаб-кватэры ААН у Нью-Ёрку. Мастачак звязваюць стасункі настаўніцы і вучаніцы, а таксама хроснай маці і хросніцы.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

На экране

Знакаміты фільм пра Хаціка загучаў па-беларуску

Гэтымі днямі, з 5 да 7 ліпеня, у кінатэатрах «Масква» і velcom cinema праект «Беларускія ўік-энды» паказвае чарговую карціну ў беларускай агучцы — знакамітую драму «Хаціка: самы верны сябар» з Рычардам Гірам у галоўнай ролі.

Да новай пасцы ў праграме ўвагу прыцягнуў адмысловы паказ у Міжнародны дзень сабак, на які гледачы маглі прыйсці з сабакамі. І прыйшлі: сеанс у арт-прасторы ОК16, што адбыўся 2 ліпеня, наведала каля 250 гледачоў, многія з якіх узялі глядзець кіно і сваіх гадаванцаў.

Фільм заснаваны на рэальнай гісторыі прафесара Уілсана і яго аднойчы падабранага на вуліцы сабакі. Кожны дзень Хаціка праводзіў свайго гаспадара на чыгуначную станцыю, з якой той адпраўляўся на працу, а ўвечары там жа сустракаў. З дня, калі галоўны герой ужо не вярнуўся з працы, Хаціка яшчэ дзевяць гадоў прыходзіў на тое ж месца ў чаканні свайго гаспадара.

Праект «Беларускія ўік-энды», што перакладае замежныя фільмы на беларускую мову і паказвае іх на вялікім экране, ажыццяўляецца кампаніяй «Кінаконг» пры падтрымцы velcom і A1. У наступных планаў праекта — паказ «Прыгод Падынгтана» і «Прыгод Падынгтана-2» з 11 да 28 ліпеня.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

Пасля пісьма

ХТО ПАДНІМЕ ПОМНІК АРТЫСТЦЫ?

На магіле тэатральнай артысткі і ветэрана вайны Тамары Узунавай паваліўся помнік, але вярнуць яго на месца няма каму. У рэдакцыю «Звязды» звярнулася вядомы тэатральны крытык Таццяна Арлова і расказала, што ўжо паўтара года на помнік «скідаюць смецце з навакольных багатых магіл», а вароты да Акадэміі мастацтваў, дзе шмат гадоў выкладала артыстка, і Купалаўскага тэатра, дзе яна выступала, аказаліся дарэмнымі.

Тамара Узунава (1906—1983) працавала ў балетных трупах Беларускага дзяржаўнага тэатра (сёння Купалаўскі тэатр) і Беларускага тэатра оперы і балета, шмат гадоў выкладала ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (сёння Акадэмія мастацтваў). «Як многія артысты балета, — піша Таццяна Арлова, — яна была адзінокім чалавекам, без сям'і і сваякоў. Тамара Узунава сібравала з маёй маці. Калі памерла, яе на Паўночных могілках (участак № 43) пахаваў інстытут, а праз год я за асабістыя сродкі паставіла ёй граніты помнік. Амаль сорак гадоў я даглядала магілу, а паўтара года таму помнік паваліўся».

Па словах Таццяны Дзмітрыеўны, па дапамогу яна звярталася да дэкана тэатральнага факультэта Акадэміі мастацтваў Уладзіміра Мішчанчука і нават перадавала ў рукі фотаздымкі магілы ў сённяшнім стане, якія той папрасіў, але праблема не была вырашана. Тады па электроннай пошце спадарыня Арлова напісала рэктару Акадэміі Міхаілу Баразне, але і гэта, як і перамовы з артыстамі-купалаўцамі, не атрымала водгуку. Зрэшты, у адказ на пытанне рэдакцыі «Звязда» атрымала афіцыйную інфармацыю за подпісам спадара Баразны, у якой паведамляецца, што з 2017 года на адрас Акадэміі мастацтваў зваротаў ад Таццяны Арловай не паступала.

«Старэйшае пакаленне артыстаў усё яшчэ памятае Тамару Узунаву. Падчас вайны яна працавала ў франтавых брыгадах. Яе ўзнагароды пасля пахавання засталіся ў Тэатральна-мастацкім інстытуце», — гаворыцца ў лісце Таццяны Арловай.

На магіле артысткі неабходна ўсяго толькі падняць помнік і замацаваць яго на аснове.

Януш Леон ВІШНЕЎСКІ:

«Калі я магу паўдзельнічаць у папулярызацыі беларускай мовы, я павінен гэта зрабіць»

Наўрад ці з сучасных польскіх пісьменнікаў нейкае імя вам вядомае лепш за імя Януша Леона Вішнеўскага — інфарматыка, хіміка, фізіка, які ў свой час прагрымеў і грыміць дагэтуль узрушальным раманам «Адзінота ў сецэе». За сусветным бестселерам пайшлі кнігі «Палюбоўніца», «Паўтарэнне лёсу», «На «Фэйсбуку» з сынам» і іншыя, але нарэшце да выдання гатова тое, чаго аматары Вішнеўскага сапраўды чакалі, — працяг «Адзіноты ў сецэе», які павінен выйсці і ў Беларусі. Сам аўтар расказаў пра гэта на творчай сустрэчы ў Мінску, арганізаванай у Дзень Польшчы 15 чэрвеня, прычым выказаў намер паспрыяць таму, каб на беларускай мове кніга выйшла раней, чым на рускай. Пасля творчай сустрэчы і ледзь не двухгадзіннай раздачы аўтографаў мы са спадаром Вішнеўскім прыселі паразмаўляць — на стале ляжалі падараныя яму палявыя кветкі, а сам пісьменнік безупынна курыў і раз-пораз смяяўся, расказаваючы пра кур'ёзы свайго жыцця.

— Чаму вы хочаце, каб ваша наступная кніга ў нашай краіне выйшла спачатку ў беларускім перакладзе?

— «Адзінота ў сецэе» была вельмі папулярная ў Беларусі, і, я думаю, калі яе працяг выйдзе спачатку на беларускай, людзі будуць больш чытаць на сваёй мове. Я не разумею, чаму ваша родная мова іграе ў краіне другую ролю: Беларусь стала сваёбытнай прыкладна ў той жа час, што і Польшча, — гэта былі цяжкія гады, але для таго, каб мова вярнулася, часу было дастаткова. У Казахстане і Кыргызстане мае кнігі таксама чытаюць на рускай. Я бываў на мерапрыемствах ПЭН-клуба ў Казахстане: яны пачыналіся на казахскай, і некаторыя казахі карысталіся навушнікамі, каб слухаць пераклад на рускую, у выніку сустрэчы ўсё роўна заканчвалося на рускай. Ва Украіне мае кнігі выдадзены на дзвюх мовах, але цяпер там іншая сітуацыя — мова стала элементам палітыкі. Я нічога не маю супраць рускай, яна вельмі прыгожая, я шчаслівы, што магу чытаць рускую класіку ў арыгінале, бо без яе цяжка ўявіць сусветную літаратуру. Але, думаю, калі я магу паўдзельнічаць у папулярызацыі беларускай мовы — нават такім нязначным элементам, як выданне кнігі, — я павінен гэта зрабіць.

— Да тэмы набыцця незалежнасці: вы неяк сказалі, што ў 1980-х, яшчэ сацыялістычнай дзяржавай, Польшча была «самая свабодная, вясёлая і праветраная». Што гэта быў за час?

— Польшча заўсёды была больш свабодная ў параўнанні з Усходняй Германіяй, Чэхаславакіяй, Венгрыяй, Балгарыяй, Румыніяй. Нам можна было, напрыклад, падарожнічаць: нашы пашпарты захоўваліся ў скрынях у аддзяленнях міліцыі, але часам гэтыя скрыні адчыняліся. Ва Усходняй Германіі, праз якую я часта праязджаў на шляху ў Заходнюю, гэта было немагчыма, як і ў СССР, дзе падарожнічаць маглі толькі спартсмены, апартачкі і людзі з сувязямі. У 80-х мне было лягчэй паехаць у Амерыку, чым у Расію: каб паехаць у Расію, трэба было атрымаць запрашэнне, але ніхто палякаў запрашаць не хацеў, а для паездкі ў Амерыку гэтага не патрабавалася.

— Свабода выяўлялася толькі ў гэтым?

— Таксама ў становішчы касцёла. Калі ў савецкіх гарадах храм мог стаць, напрыклад, басейнам, то ў Польшчы абмежаванняў у рэлігіі не было. Дакладней, польская савецкая ўлада спрабавала з ёй змагацца, але ведала, што ніколі ў гэтай барацьбе не пераможа. Касцёл стаў нефармальнай апазіцыяй, носьбітам свабоды. Можна сказаць, рух «Салідарнасць» пачаўся з таго, што Папам Рымскім стаў паляк. Менавіта Ян Павел II прыехаў у Польшчу з меседжам «Свабода». Студэнтам я працаваў гідам для турыстычных груп: калі прыязджалі рускія, яны хацелі перш за ўсё схадзіць на стрыптыз і, хоць на польскай, паглядзець які-небудзь амерыканскі фільм, таму што ў Савецкім Саюзе іх не пракатавалі. У нашых кінатэатрах заўсёды былі амерыканскія, французскія, шведскія карціны, і само польскае кіно 1980-х стала найлепшым у Еўропе. Кшыштаф Кесьлёўскі, Анджэй Вайда, Кшыштаф Занусі, Агнешка Холанд заўсёды, можа, і не адкрыта, а паміж радкоў, знаходзіліся ў апазіцыі ўладзе.

— Вы з'ехалі ў Германію толькі з прафесійных амбіцый?

— Так, у 1980-х ва Усходняй Еўропе доступ да тэхналогій быў моцна абмежаваны. На захадзе былі 16-бітныя камп'ютары, а ў Польшчы і Савецкім Саюзе толькі 8-бітныя. Я напісаў кандыдацкую працу па інфарматыцы ў ЗША і калі вярнуўся ў Польшчу, у мяне было адчуванне, што я працую ў музеі і ахоўваю камп'ютар, які ніхто не хоча ўкрасці. Ён быў выраблены ў СССР. Я шукаў магчымасці з'ехаць туды, дзе змагу выкарыстаць свае веды і развівацца, і адночы мой сябар запрасіў мяне зрабіць даклад у адным з інстытутаў у Франкфурце-на-Майне. Мне абяцалі заплаціць за гэта трыста марак, а ў Польшчы ў месяц я зарабляў пяцьдзясят, да таго ж замежная валюта адкрывала ў нашых крамах шырокія магчымасці. І я паехаў. Пасля даклада дырэктар інстытута прапанаваў мне застацца ў іх працаваць. У першы дзень працы ў Германіі я атрымаў асобны кабінет, дзе на рабочым стале стаялі адразу два найноўшыя камп'ютары, а ў гэты час у Польшчы ў нас на ўвесь універсітэт быў толькі адзін. Спачатку было цяжка: я не размаўляў на нямецкай і не меў да немцаў якіх-небудзь цёплых пачуццяў, паколькі мой бацька чатыры гады быў вязнем канцэнтрацыйнага лагера. Але ў выніку Франкфурта-на-Майне стаў маёй маленькай радзімай, па якой пасля пераезду ў Польшчу я сумую.

— У мяне якраз было падрыхтавана пытанне аб патрыятызме: вы трыццаць два гады пражылі ў Германіі, але ўсё роўна вярнуліся ў Польшчу...

— Мне здаецца, кожны паляк, знаходзячыся ў эміграцыі, пакідае нераспакаваным адзін віртуальны чамадан, які заўсёды гатовы да вяртання. Усе трыццаць два гады гэты чамадан быў у мяне напагатове. Мае дочкі — ужо іншыя, яны любяць бываць у Польшчы, але жыць там не хочуць. Усё самае важнае ў іх здарылася ў Германіі. Памятаю, мы з сям'ёй былі ў ЗША і зайшлі паабедаць. Нехта спытаў нас, адкуль мы прыехалі: мы з жонкай адказалі, што з Польшчы, а нашы дочкі, што з Германіі. Мы ўсё зрабілі, каб прывыць дзецям польскую мову і культуру, але калі сёння спытаць іх, хто яны, — скажуць, што немкі.

— Як змянілася Польшча ў параўнанні з тым, з якой вы з'ехалі?

— Проста неверагодна змянілася: я з'язджаў з камуністычнай дзяржавы, а вярнуўся ў сучасную заходнюю краіну з дэмакратыяй, свабодай, развітай інфраструктурай, дзе можна купіць усё, чаго было нельга купіць у 1980-х, дзе ёсць магчымасць падарожнічаць, дзе працавітыя людзі могуць зарабляць добрыя грошы. У 1987 годзе ў Польшчы было толькі дзевяць кіламетраў аўтастрады, і тая пабудаваная немцамі, а цяпер па аўтастрадзе я магу даехаць з Франкфурта ў Варшаву: у 1980-х ні адзін наркотык не прымусіў бы мяне такое ўявіць. Калі ў 80-я рабілася сумна, можна было ўзяць бутэльку гарэлкі і пайсці да некага раздзяліць яе. Цяпер, калі ты прыйдзеш у госці без папярэджання, ні ў кога на цябе не будзе часу. Сённяшняя Польшча зусім іншая.

— Хачу пераключыцца на такі, мякчуючы па ўсім, блізкі вам стан, як меланхолія. Стагоддзямі яе лічылі хваробай і прыдумлялі разнастайныя спосабы лячэння. Як вам здаецца, яе трэба лячыць?

— Не, не трэба, без меланхолії не было б паэзіі, французскага рамантызму, Міцкевіча і Гётэ. Жыццё ў цэлым вельмі тужлівае: штодня мы робім адны і тыя ж дзеянні і толькі на піках сінусоіды, па якой усё развіваецца, адчуваем шчасце. Нават каханне, якое пачынаецца так ярка, у рэшце рэшт губляе сваю насычанасць. Я часта адчуваю меланхолію, у гэтым стане мне лягчэй пісаць, таму што менавіта драмай хочацца дзяліцца. І кнігі мае вельмі сумныя. Акрамя таго, у нас, у славян — беларусаў, палякаў, украінцаў, рускіх — шчасце магчыма толькі праз пакуту. Напэўна, таму, што наша гісторыя ёй поўная. Галандцы, напрыклад, думаюць, што шчаслівым можна быць пастаянна; у Швейцарыі ніякіх войнаў не было, і людзі не ведаюць, што такое сапраўдная трагедыя (але гэта нудны народ).

«Я памятаю, як у часы Савецкага Саюза мы думалі, што на Захадзе ўсе багатыя, шчаслівыя і ездзяць на машынах, — гэта была ідэалізацыя свету, у якім мы не былі».

— У мяне выклікае нейкі дысананс ваша паэтычнае стаўленне да кахання і тое, як вы тлумачыце яго з пункту гледжання навукі. Хіба адно другому не супярэчыць?

— З пункту гледжання фізіялогіі можна растлумачыць любое пачуццё — нуду, пакуту, сорам і гэтак далей. Я гляджу на каханне як навуковец, а ўвечары саджуся пісаць кнігу і гляджу на яго ўжо як паэт. Уявіце сабе астранома, які сядзіць каля мора і глядзіць на змярканне: краявід цудоўны, але астраном ведае, напрыклад, што сонца — гэта сярэдняй велічыні зорка, тэмпературна паверхні якой складае шэсць тысяч кельвін, дзе энергія выпрацоўваецца ў выніку сінтэзу гелію і вадароду і гэтак далей, але астраном такама астрамлівае асалоду ад віду. Так і навуковец, калі ён закаханы, не думае пра хімію. І потым, на галоўныя пытанні, чаму гэтыя канкрэтныя працэсы адбываюцца ў мозгу, то-бок як і калі каханне пачынаецца, ніхто не адказаў. Я ведаю, што адбываецца ў вас у галаве, але не ведаю, чаму. Думаю, навукоўцы ніколі гэтага не пазнаюць. Калі б яны адкрылі, як справаковаць тыя ці іншыя пачуцці, гэта быў бы жах.

— Калі чытаеш вашы кнігі, здаецца, што адной са сваіх задач вы ставіце даследаванне жаночай натуры. Наколькі гэта даследаванне паспяховае?

— Яшчэ маладым чалавекам я заўважыў, што жанчыны іншыя, інакш думаюць, могуць у адну хвіліну перайсці ад абсалютнага энтузіязму да слёз (у мужчын такое бывае толькі ад гарэлкі). У пятнаццаць гадоў я пачаў навучанне ў марской школе. Я памятаю, як у часы Савецкага Саюза мы думалі, што на Захадзе ўсе багатыя, шчаслівыя і ездзяць на машынах (калі я стаў наведваць заходнія краіны, зразумеў, як мы памыляліся), — гэта была ідэалізацыя свету, у якім мы не былі. Прыкладна тое ж самае было ў марской школе: дзяўчат тады не прымалі, а калі ў тваім жыцці чагосьці няма, ты пачынаеш гэта ідэалізаваць. Мы сустракалі іх толькі на танцах, менавіта тады я і пачаў сваё даследаванне.

— І зразумелі, што дарэмна ідэалізавалі?

— Я думаю, жанчыны — найлепшы пол. У тым ліку з пункту гледжання фізіялогіі. Мужчынскія паводзіны грунтуюцца на жудасным рэчыве — тэстастэроне, які справакаваў шмат войнаў і разводаў. У жанчын тэстастэрону вельмі мала, затое ёсць неверагодна прыгожае, нават на экране манітора, рэчыва — аксітацын. Яно з'яўляецца ў самыя важныя моманты жыцця — без аксітацыну не было б аргазму, падчас родаў не раскрылася б шыйка маткі, немагчыма было б пакарміць дзіця грудзьмі. Аксітацын таксама адказвае за адносіны, гэта гармон вернасці. У мужчын аксітацыну вельмі мала, толькі ў адзін момант узровень гэтага гармону ў іх высокі — пасля эякуляцыі, і ў гэты час яны адчуваюць, што хацелі б правесці з жанчынай, якая побач, усё жыццё. Праўда, такая канцэнтрацыя аксітацыну для іх нязвыклая, таму пасля эякуляцыі яны часта засыпаюць. Так што, калі вы такое назіраеце, не думайце, што ваш мужчына вас не любіць, гэта проста «хімія».

— Ваша кніга-інтэрв'ю «Арытмія пачуццяў» поўная размоў пра тое, як за кар'ерай гонкай у вас не заставалася часу нават на сям'ю. У такім выпадку на якім вопыце вы засноўваецеся, калі пішаце кнігі? Бо ўсе гэтыя гісторыі патрабуюць даследавання, а значыць, і часу.

— Я шмат працаваў, але гэта не значыць, што я не сустракаўся з людзьмі. Мне часта даводзілася падарожнічаць, неяк я паліўчы, што спыняўся ў больш чым 2500 гатэлях, гэта нават стала асновай адной з маіх кніг. Я сустракаў шмат людзей і чуў шмат гісторый, якія потым выкарыстоўваў у сваіх творах. Мне наогул небяспечна нешта расказваць. Герой «Адзіноты ў сецэе» — мой сябар, правобраз жаночага персанажа — мая знаёмая, я сам прыязджаў удзел у іх рамане. Калі я напісаў кнігу «Палюбоўніца», стаў атрымліваць тысячы лістоў ад жанчын (па чым можна меркаваць, як шмат у свеце палюбоўніц), у якіх мяне пыталіся, адкуль я ведаю гэтую гісторыю. А я проста знаёмы з гераіняй кнігі і вельмі шмат з ёй размаўляў.

— Але калі вы пісалі «Адзіноту ў сецэе», маглі чакаць такі інтарэс з боку менавіта жаночай аўдыторыі?

— У мяне ў галаве не было наогул ніякага чытача, паколькі я пісаў кнігу як дзённік і ніколі не думаў, што стану пісьменнікам. Гэта быў 1997 год, я перажываў цяжкія часы, мая жонка была нешчаслівая са мной, таму што я быў увесь час заняты работай. Я ж быў упэўнены, што рабліў усё для сям'і: зарабляю грошы і магу кожныя два гады купіць нам новы «Мерседэс». Наш шлюб распадаўся, і я хацеў нешта зрабіць са сваім сумам. Псіхатэрапеўт параіў мне весці дзённік — я пачаў пісаць і кінуў хадзіць да псіхатэрапеўта. Адночы, праз два гады, я выпіў віна і даслаў урывак з напісанага свайму сябру — літаратурнаму крытыку з Варшавы. Яму спадабалася, і ён прапанаваў гэта апублікаваць. Я спытаў: «Дзе?» — «Ну, у часопісе» — «У якім?» — «У Playboy». У некаторых краінах Playboy быў вельмі амбіцыйны ў галіне літаратуры, у гэтым часопісе пачалі сваю кар'еру Стывен Кінг і Салман Рушдзі, а ў Польшчы дзбютант мог з'явіцца толькі ў Playboy. Я адмовіўся, таму што быў прафесарам ва ўніверсітэце і не мог дазволіць, каб мае студэнты мяне там чыталі, але сябар прапанаваў апублікаваць пад псеўданімам, і я пагадзіўся. Такім чынам, у красавіку 2000 года ў польскім Playboy з'явілася маё апавяданне пад назвай «Ch@at», а на апошняй старонцы часопіса быў апублікаваны спіс аўтараў, сярод якіх быў і я... з фатаграфіяй і біяграфіяй. Мае студэнты ў выніку прыходзілі да мяне з гэтым часопісам і прасілі падпісаць. А потым мой сябар прапанаваў апублікаваць кнігу. Для невядомага аўтара гэта было вельмі складана, у мяне было ўражанне, што ў Польшчы больш людзей піша кнігі, чым чытае: спартсмены пішуць, акцёры пішуць, кухары пішуць. Ніхто не чытае — усе пішуць. І калі я разаслаў «Адзіноту ў сецэе» па выдавецтвах, напісаў, што ўжо маю літаратурны вопыт: «Маё апавяданне было апублікавана ў Playboy!» Адказала мне толькі адно маленькае выдавецтва, а астатнія страцілі мільёны.

«У нас, у славян — беларусаў, палякаў, украінцаў, рускіх, — шчасце магчыма толькі праз пакуту. Напэўна, таму, што наша гісторыя ёй поўная».

— Вы чыталі водгукі крытыкаў на вашы раманы?

— Так, у асноўным яны былі негатыўныя. Крытыкам не падабалася, што нейкі вучоны з Германіі з такім банальным прозвішчам напісаў меладраму і прадае так шмат яе асобнікаў. Літаратурная крытыка ў Польшчы памерла: цяпер гэта фатаграфія вокладкі, зорачкі рэйтынгу і апісанне зместу. Можа быць, у Беларусі інакш. У выніку выдавец папрасіў мяне напісаць другую кнігу. Я спытаў: «Пра што?», а мне адказалі: «Пра што-небудзь». То-бок, «Адзінота ў сецэе» была настолькі папулярнай, што я мог напісаць нават пра тое, як рэчы бліны, і гэта б раскупілі. Ва ўніверсітэце на мой літаратурны поспех глядзелі падазрона. Адзін калега сказаў: «Януш, я думаў, ты сур'ёзны чалавек, а ты раманы пішаш», — праўда, вечарам за келіхам віна ён прызнаўся, што зайздросціць мне. У маім інстытуце ў Германіі восем гадоў ніхто не ведаў пра мае кнігі, хоць яны ўжо сталі бестселерамі, а па «Адзіноце ў сецэе» выйшаў фільм. Усё раскрылася, калі мой шэф паехаў у Санкт-Пецярбург і падчас прагулкі па Нявоўскім праспекце ў вітрыне кнігарні ў будынку дома Зінгера ўбачыў маю фатаграфію.

— Па тых лістах, якія вам дасылалі, можна сказаць, што вашы кнігі мянялі жыцці людзей?

— У пік папулярнасці «Адзіноты ў сецэе» я атрымаў пятнаццаць тысяч лістоў. Я ўсё чытаў, але не адказваў, некаторыя былі надзвычайныя. На адну з маіх прэзентацый прыйшоў мужчына і без кнігі адстаяў у чарзе па аўтограф, каб, як ён потым сказаў, «даць мне ў морду». Аказалася, яго жонка неяк чытала «Адзіноту ў сецэе», і, паколькі гэта перашкаджала яму спаць, ён «адаслаў» яе на кухню. У выніку жанчына чытала кнігу да чатырох раніцы, узяла чамадан і сышла. У морду ён мне ўсё ж не даў. З лістоў я даведаўся, што з-за гэтага рамана адбылося каля сарака разводаў, але таксама здараліся і вяселлі, мяне нават на іх запрашалі. 85 працэнтаў е-мэйлаў мне напісалі жанчыны. Яны прызнаваліся, што незадаволеныя сямейным жыццём, і пыталіся ў мяне рады. А мужчыны ў сваіх лістах пратэставалі: казалі, што я — ідыёт, які забылтавае іх жонак. Але некаторыя прызнаваліся, што пасля прачытання «Адзіноты ў сецэе» сталі больш любіць сваю жонку, размаўляць з ёй і купляць ёй кветкі.

Гутарыла Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.
Фота са старонкі Януша Вішнеўскага ў «Фэйсбуку».

Стыль

«Рэдкі мужчына можа правільна камбінаваць рэчы»

Чаму беларусаў складана апрануць па модзе

Людміла ТАРАКАНАВА — вядомы мадэльер, дацэнт кафедры дызайну і моды ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, удзельніца модных паказаў і выставак лёгкай прамысловасці ў Дзюсельдорфе, Кёльне, Калінінградзе, Маскве, Львове, Лодзі і іншых гарадах. Віцебскі дызайнер адзення стварыла некалькі дзясяткаў унікальных калекцый, поспехам адзначаны яе неаднаразовыя паказы аўтарскіх калекцый на Беларускім тыдні моды ў Мінску. Мадэлі Тараканавай апублікаваныя ў часопісах моды і стылю — італьянскім Collezioni, расійскім Fashion Collection і некаторых іншых. Мадэльер расказала карэспандэнту «Звязды» пра асноўныя тэндэнцыі мужчынскай моды будучага сезону і пра тое, як можна развіць пачуццё стылю ў нашага дужага полу.

Фота Таццяны ТАНАЎСКАЙ.

— На самай справе пачуццё стылю цесна звязана з пачуццём колеру. У многіх маіх студэнтаў бачна прыроджанае пачуццё стылю, яны нібыта інтуітыўна працуюць з тканінай і колерам. Але я ўпэўнена, што гэта пачуццё можна і развіць. Бацькі могуць аддаць сваё дзіця ў мастацкую школу ці нейкі гурток па выяўленчым мастацтве. Справа ў тым, што там малых знаёмяць з колеравай гармоніяй, што існуе ў свеце, і творамі вялікіх людзей і такім чынам прывіваюць густ. Даросламу чалавеку таксама можна развіць пачуццё стылю, калі ён з дапамогай інтэрнэту, спецыяльнай літаратуры і прафесіяналаў возьмецца за самаадукацыю ў гэтым кірунку.

А жанчына можа адразу выглучыць у камплекце для сябе, напрыклад, спадніцу і ўявіць, з чым яна магла б скамплектаваць яе, падабраць абутак і аксесуары, каб падаць вобраз па-новаму. Для жанчыны важныя і крой, і колер, і дэкор. Калі ж трэнды састарэлі, то ад жанчыны можна пачуць фразу: «Мне няма чаго надзець».

Гэта ўсё датычыцца, бадай што, нашага рэгіёна. Калі казаць, напрыклад, пра ўсходнія краіны, дзе захоўваюцца традыцыі, то акцэнты ў модзе змяшчаюцца на якасць тканіны і дэкор. А вось у амерыканцаў важная функцыянальнасць адзення, каб было зручна насіць. Канешне, мне як дызайнеру хочацца верыць, што працэнт людзей, якія будуць сачыць за тэндэнцыямі ў модзе, павялічыцца, а нашы мужчыны змогуць дакладна вызначыць сваю рэч, якая будзе пасаваць і характару, і атачэнню.

— Вам прынеслі вядомасць калекцыі мужчынскага адзення. Напэўна, вы ўлавілі, чым адрозніваецца ўспрыманне моды мужчынамі і жанчынамі?

— І сапраўды, успрыманне моды ў іх вельмі розныя. Для мужчын мода — гэта перш-наперш сексуальнасць. Ім на самай справе ўсё роўна — гэта мода стылістычная або масмаркет. Тым больш рэдкі мужчына можа правільна камбінаваць рэчы. Таму, працуючы з мужчынскім адзеннем, я разумею, што іх камплекты павінны быць завершанымі.

— Вы сказалі, што многае залежыць ад рэгіёна. Ці проста рабіць адзенне для беларусаў?

— Беларускіх мужчын апрануць вельмі складана *(смяецца)*. Ну вось, напрыклад, усім вядомыя тыдні моды. Падчас нашага, беларускага, тыдня моды адзінкі звяртаюцца, каб набыць нейкую рэч. У іншых краінах на падобных мерапрыемствах момантам залятаюць за кулісы людзі, яны мацаюць рэчы, просяць прымерыць, спрабуюць дамовіцца. Людзям у Еўропе падабаецца мой стыль, ён дае магчымасць разняволіцца і расслабіцца. Нашы мужчыны мне здаюцца трошкі закамплексаванымі, быццам не дазваляюць сваім уяўленням. Напэўна, такія ж перашкоды ёсць і ў ёсць джынсы, яны не купляюць другія, бо не разумеюць, навошта.

Хоць цяпер у нас і няма дэфіцыту, як раней, калі кожная рэч даставалася з цяжкасцю. Ды і абароты адзення ў нашай краіне іншыя... Напрыклад, на Захадзе палажала рэч месяц у краме — адзін кошт, палажала другі — другі і гэтак далей. У нас такога няма! Павесілі рэч у краме, і будзе вісець яна гадамі па тым жа кошце.

Мне здаецца, што такія адносіны да свайго знешняга выгляду ў беларусаў выпрацаваныя пакаленнямі: вось маці набыла сыночку адзенне, адпрасавала і павесіла на крэсла, малы апрануў, і думаць не трэба, такая прыкладна схема пераходзіць і ў дарослае жыццё мужчыны. Але я ўсё ж спадзяюся, што паступова сітуацыя будзе мяняцца і беларускія мужчыны захочуць выбіраць сабе адзенне і станавіцца да гэтага з большай цікавасцю.

— Раскажыце пра сучасныя тэндэнцыі ў модзе мужчынскага адзення.

— Сёння на піку папулярнасці кроены і вязаны трыкатаж. Швэдры могуць быць двух тыпаў: павялічана-шырокія або ў духу 1970-х гадоў, калі шчыльна прылягаюць да фігуры, але тады іх лепей запраўляць у штаны.

Неад'емная частка мужчынскага гардэроба — футболкі з кароткага трыкатажу. Сёння яны інавацыйна прадстаўлены камбінацыяй з розных матэрыялаў і структур, напрыклад, такіх як бавоўна, сеткаваты трыкатаж, плашчовая тканіна, галантарэйныя стужкі і рыбаны па рукавах і ґнізе, — у духу васьмідзясятых гадоў.

Гэтак жа лічыцца модным і друкаваны малюнак. Пачынае набіраць абароты тэма гладкай і чыстай паверхні. Колер можа быць розны, але пажадана насычаны — хакі, тэракотавы, сіне-шэры ці чырвоны.

Таксама ў гэтым і будучым сезоне захоўваецца прысутнасць дзелавога стылю.

Можна яшчэ заўважыць у людзей павальнае захапленне малюнкам «клетка». Яна можа быць як статычнага, так і дынамічнага парадку. Напрыклад, усімі любімая клетка «арлекін» на камізэльках і кардыганах. Клетка як модны трэнд з шарсцяных і паўшарсцяных тканін перанесена на іншыя структуры, ў прыватнасці на плашчавыя, атласныя, вісказныя і трыкатажныя асновы.

Мужчынскі гардэроб немагчыма ўявіць без штаноў! Дык вось цяпер модная стылістыка 1930-х гадоў. Штаны такія вырабляюцца з завышанай лініяй таліі і больш аб'ёмныя ў зоне сцягна.

Што ж датычыцца класічных пінжакоў, то значны ўплыў аказвае ўсё тая ж мода трыццатых, калі ўсе мужчыны насілі цёмныя ў дробную палоску прамога крою двухбортныя пінжакі. Пасадка пінжакоў робіцца больш свабоднай.

Калі казаць пра дэмісезонную вопратку, то ў трэндзе двухбаковыя мадэлі з двух функцыянальных слаёў. Смелы дэкор у выглядзе шрыфтоў, настрачных стужак і сцяжкоў, аб'ёмных кішэняў і кантрасных аплікацый канчаткова замацаваўся на верхнім адзенні. Рэкамендую мужчынам звярнуць увагу на вопратку, даўсюль якой крыху вышэйшая ці ніжэйшая калена.

— На ваш погляд, якое адзенне можна смела набыць, каб быць упэўненым, што яно не выйдзе з моды?

— Я доўга думала над гэтым пытаннем. Можна прапанаваць касуху — гэта такая кароткая скураная куртка. Форма касухі застаецца стандартнай, класічнай на працягу ўсяго часу яе існавання. Ды і я сама кожны год пакідаю касуху ў сваёй калекцыі, магу толькі памяняць колеравае рашэнне. Увогуле лічу, што касуха — супер.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Беларусь памятае

ФІЛАСОФІЯ ТВОРЧАСЦІ ЛЕАНІДА ЛЕВІНА

Выстаўка «Леанід Левін. Філасофія творчасці» адкрылася ў фотадакументальнай экспазіцыі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Яна праходзіць у межах мерапрыемстваў, прысвечаных 50-годдзю з дня адкрыцця мемарыяльных комплексаў «Хатынь» і «Курган Славы».

Комплекс «Хатынь» набыў сусветную славу і стаў знакавым месцам і візітнай карткай Беларусі. Мемарыял аб'ядноўвае ў сабе памяць пра жыхароў вёскі Хатынь, спаленых карнікамі ў сакавіку 1943 года, і жыхароў беларускіх вёсак, якія раздзялілі іх лёс. Творчая група аўтараў мемарыялу — архітэктары Леанід Левін, Юрый Градаў, Валянцін Занковіч і скульптар Сяргей Селіханаў — змаглі паказаць трагедыю ахвяр фашызму і ўсяго беларускага народа.

Леанід Левін — вядомы архітэктар, грамадскі дзеяч, Заслужаны архітэктар Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Ленінскай прэміі камсамола, двойчы лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэат многіх прэстыжных конкурсаў, акадэмік Міжнароднай і Беларускай акадэмій архітэктуры.

Творчасць Леаніда Левіна — шматгранная і шматпланавая. Яго імя шырока вядома не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Работы Леаніда Левіна, выкананыя ім асабіста і ў суаўтарстве з калегамі, даўно сталі сімваламі многіх беларускіх гарадоў. Гэта мемарыяльны комплекс «Прарыў» (1974-ы, у суаўтарстве з Юрыем Градавым і Анатолем Анікейчыкам), мемарыяльны комплекс «Праклятыя фашызму» ў памяць спаленых населеных пунктаў Докшыцкага раёна і вёскі Шунеўка (1983-і, у суаўтарстве з Юрыем Градавым і Анатолем Анікейчыкам), мемарыял «Шталаг-342» у Маладзечне (1990-ы), мемарыял ахвярам Халакоста «Яма» (2000-ы), мемарыяльны комплекс загінулым яўрэям Гарадзейскага гета, мемарыял дзецям —ахвярам вайны ў Красным Беразе Жлобінскага раёна і іншыя. Праект мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» ва ўрочышчы Благаўшчына, прадстаўлены ў 2013 годзе, быў рэалізаваны пасля смерці аўтара.

Леанід Левін — не толькі архітэктар, але і філосаф, гуманіст, майстар па стварэнні лаканічнай простай формы, якая выклікае ў той жа час пачуццё хвалявання і дасканаласці. Кожная яго работа прымушае задумацца пра месца чалавека на вайне і ў свеце, каштоўнасць жыцця.

На выстаўцы прадстаўлена невялікая частка творчай спадчыны архітэктара, якая ўключае работы розных гадоў — з канца 1960-га да 2014-га, макеты помнікаў, асабістыя рэчы. На выстаўцы прадугледжаны паказ дакументальнага фільма «Маналог», расказа Леаніда Левіна пра стварэнне сваіх работ. Наведвальнікаў суправаджаюць развагі пра кожны помнік.

Літаратурны талент Леаніда Левіна падарыў нам напоўненыя бясцэннымі ўспамінамі пра творчы пошук і перыпетыі лёсу кнігі «Хатынь» і «Пераможць перажытае», поўны напружанай глыбіні пазатычны зборнік «Імгненне», драму «Вайна і каханне». Хатынь назаўжды засталася для яго часцінкай жыцця. У сваіх успамінах Леанід Левін пісаў: «Змяны шар. Як гэта многа і як мала. Сёння для нас цэнтрам змянога шара стала Хатынь. Гады творчасці, гады жыцця. Не адзін і не два аддалі мы гэтаму маленькаму кавалачку беларускай зямлі...»

Выстаўка падрыхтаваная дзяржаўнай установай «Гісторыка-мемарыяльны комплекс «Хатынь» сумесна з унітарным прадпрыемствам «Творчая майстэрня архітэктара Левіна Л. М.» і сям'ёй архітэктара.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

Даты Падзеі Людзі

6 ЛІПЕНЯ

У краіне

1864 год — нарадзілася Аўфрасіння Міхайлаўна Гарэцкая, беларуская народная спявачка. Свабодна валодала рознымі стылямі выканання, спевам з «пераліваміі» ў адпаведнасці з традыцыямі беларускага Падняпроўя. Яе рэпертуар складаўся пераважна з сямейна-абрадавых і каляндарных песень, сярод якіх асаблівай разнастайнасцю вылучаліся радзінныя, вясновыя, вяселныя, жніўныя песні. 318 тэкстаў з мелодыямі склалі асобную кнігу «Народныя песні з мелодыямі». Памерла ў 1935 годзе.

1894 год — нарадзіўся Ілья Сцяпанавіч Федасеенка, адзін з кіраўнікоў партызанскага руху на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З 1918-га ў Чырвонай Арміі, камандзір узвода, роты, батальёна, стралковай дывізіі. З 1940 года дырэктар Гомельскага аўтарамонтнага завода. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1941-га да жніўня 1943-га камандзір партызанскага атрада «Бальшавік» Гомельскага партызанскага злучэння, член Гомельскага падпольнага гаркама КП(б) Б. За партызанскага камандзіра гітлераўцы абяцалі буйное ўзнагароджанне. У снежні 1943-га вярнуўся на Гомельскі аўтарамонтны завод. Памёр у 1947 годзе. Яго імем названа вуліца ў Гомелі.

У свеце

1859 год — нарадзіўся Карл Густаў Вернер фон Хейдэнстам, шведскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па літаратуры (1916). Аўтар літаратурнага маніфеста неарамантызму «Рэнесанс», вершаў, апавяданняў. Памёр у 1940 годзе.

1929 год — нарадзіўся Сяргей Іванавіч Яўдошанка, акцёр, рэжысёр, заслужаны артыст Беларусі (1963). У 1950 годзе скончыў Адэскае тэатральнае вучылішча, у 1975-м — рэжысёрскую лабараторыю пры Маскоўскім тэатры імя Маякоўскага. З 1955 года — акцёр і рэжысёр (у 1979—1981-м, 1993—1995 гадах — галоўны рэжысёр) Брэсцкага тэатра драмы і музыкі. Памёр у 2009 годзе.

1919 год — нарадзіўся Барыс Ісакавіч Балтэр, пісьменнік, удзельнік савецка-фінскай і Вялікай Айчыннай вайнаў. Самы вядомы твор пісьменніка — аповесць «Да пабачэння, хлопчыкі», надрукаваная ў 1962 годзе ў часопісе «Юность», пазней перапрацаваная ў п'есу і экранізаваная рэжысёрам Міхаілам Калікам. Памёр у 1974 годзе.

1919 год — брытанскі дырыжабль R-34 прызямліўся ў Нью-Ёрку. Гэта першае пасьветранае судна, якое ўдала пераляцела Атлантычны акіян.

1946 год — нарадзіўся Сільвестр Сталоне, амерыканскі акцёр, кінарэжысёр, сцэнарыст і прадзюсар. За сваю акцёрскую кар'еру зняўся больш чым у 50 фільмах. У снежні 2016-га прэзідэнт ЗША Дональд Трамп прапанаваў Сталоне пасаду старшыні Нацыянальнага фонду мастацтваў і гуманітарных навук, ад якой той адмовіўся.

1973 год — англійскі гурт Queen выпусціў свой першы сінгл Keep Yourself Alive. Ён выйшаў у фармаце 7" пласцінкі ў 14 краінах.

1994 год — парламент Казахстана прыняў рашэнне аб перанясе сталіцы рэспублікі з Алма-Аты ў Акмалу (з 1998 года — Астана). У лістападзе 1994 года новая сталіца Казахстана была ўдастоена прэміі ЮНЕСКА «Горад свету». Сёлета ў сакавіку Астана перайменавана ў Нур-Султан.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.46	21.42	16.56
Віцебск	4.27	21.40	17.13
Магілёў	4.36	21.32	16.56
Гомель	4.42	21.20	16.38
Гродна	5.03	21.56	16.53
Брэст	5.13	21.47	16.34

Месяц

Маладзік 2 ліпеня.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Сафі, Ульяны, Антона, Арцёма, Барыса, Георгія, Германа, Дзяніса, Сямёна, Фёдара.*
К. *Дамінікі, Люцыі, Тэрэзы, Эдварда.*

Фота Анатоля КІЕЛЬНІКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	КІЕЎ	РЫГА	
+20..+22°С	+26..+27°С	+14..+16°С	
ВІЛЬНЮС	МАСКВА	С.-ПЕЦЯРБУРГ	
+18..+20°С	+18..+20°С	+16..+18°С	

УСМІХНЕМСЯ

— Падары ёй пярсцёнак. Каб усе бачылі, што яна занятая.
— Я лепш сам заўсёды побач буду: гэта больш надзейна.

Форум медыкаў.

«Нарэзанае мяса кладзеш на патэльню, смажыш, дзесьці паміж другой і трэцяй ступенню апёку дадаеш гародніну».

У бухгалтэрыі:
— Як думаеш, грошы, выдатковыя на корм сабакам, лагічна спісаць на артыкул «Ахоўная і пажарная сігналізацыя»?..

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІК: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА. ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІПЕНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гомелі: 28 27 27, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтарыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй лісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2335.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 5 ліпеня 2019 года.